Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

26 ЖНІЎНЯ 2017 г. СУБОТА №164 (28528)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

**Ці варта пазычаць грошы сябру «УКантакце»**

СТАР. 4

**Што здымае «Беларусьфільм»**

СТАР. 8

**Экстрым ад... нашых чытачоў**

СТАР. 13

# «Запаведная» дынастыя

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Валерый і Яўгенія ІЎКОВІЧЫ амаль сорак гадоў таму пачалі сваю навуковую прыродаахоўную дзейнасць у Бярэзінскім біясферным запаведніку, абаранілі дысертацыі, сталі кандыдатамі сельскагаспадарчых навук. Унёсак гэтай сям'і ў беларускую навуку вялікі. Яўгенія Мікалаеўна з'яўляецца вядучым навуковым супрацоўнікам і з групай батанікаў вядзе маніторынг флоры на ўсёй тэрыторыі запаведніка. Валерый Сямёнавіч — балотазнавец, намеснік дырэктара запаведніка па навуцы. Іхнія сыны Дзяніс і Арцём таксама шчыруюць на ніве аховы навакольнага асяроддзя — пасля заканчэння ВНУ яны вярнуліся на радзіму і працуюць побач з бацькамі. Дзяніс — біёлаг, займаецца экалогіяй адкрытых экасістэм, а малодшы Арцём — вядучы інжынер лясной гаспадаркі запаведніка.**

## ЦЫТАТА ДНЯ

**Аляксандр ЧАРВЯКОЎ, намеснік міністра эканомікі:**

*«У якасці асноўных рэзерваў для падтрымання тэмпаў росту на ўзроўні вышэй за 105% трэба адзначыць рэалізацыю шэрагу інвестпраектаў у лёгкай прамысловасці і вытворчасці аўтамабільных шын, рост адгрузак прадукцыі айчыннага машынабудавання на рынку Расіі, выкарыстанне спрыяльнай кан'юнктуры на рынку калійных угнаенняў. Трэба адзначыць, што дынаміка росту зарплаты і грашовых даходаў насельніцтва становіцца драйверам росту рознічнага тавараабароту і ў цэлым акажа стымуляцыйны ўплыў на развіццё сферы паслуг».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 26.08.2017 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 1,9333 ▼ |
| Еўра | 2,2789 ▼ |
| Рас. руб. | 0,0327 ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0756 ■ |

ISSN 1990 - 763X

■ Сітуацыя

## НЕДАБОР У... АРМІЮ

**У Гродзенскай вобласці за апошнія 10 гадоў узровень прыдатнасці юнакоў да воінскай службы знізіўся на 20%**

**Хоць праз прызыўныя камісіі сёлета прайшло больш за пяць тысяч юнакоў, у рады Узброеных Сіл трапіла толькі 1400 чалавек. А гэта на паўтары сотні менш даведзенага плана. Прычыны недабору розныя. Гэта і недастатковая колькасць прызыўных рэсурсаў, і вялікі працэнт адтэрміноўкі (72%), і вялікая колькасць тых, хто мае праблемы са здароўем.**

### Абы «адкасіць»

З'явілася і новая тэндэнцыя. Некаторыя з тых, хто не жадае служыць, але не мае адпаведных падстаў для гэтага, знайшлі нечаканае выйсце. Напрыклад, падчас вясновага прызыву некалькі маладых людзей у стане моцнага алкагольнага ап'янення атрымалі адміністрацыйныя пакаранні. І гэта адбылося літаральна перад адпраўкай. Такі кураж дазволіў ім трапіць у разрад тых прызыўнікоў, якім не рэкамендавана служба ў арміі. На думку **намесніка начальніка ваеннага камісарыята Аляксандра ВЯНСКОВІЧА**, гэта не што іншае, як ухіленне ад прызыву. Ён лічыць, што новая з'ява можа распаўсюдзіцца, і гэты паток трэба як мага хутчэй спыніць.

Разам з тым у армію не павінны трапіць асобы, якія пакутуюць на залежнасць ад алкаголю. Так атрымалася з Андрэем К. Хлопец падчас прызыўной кампаніі атрымаў неблагую характарыстыку ад участковага міліцыянера, родныя пацвердзілі, што ён не злоўжывае спіртным. У выніку 25-гадовы прызыўнік быў адпраўлены выконваць свой воінскі абавязак. Але ўжо на другі дзень у яго праявіўся сіндром алкагольнай залежнасці. Аказалася, што ён з 15 гадоў пачаў злоўжываць спіртным. Праходзіў стацыянарнае лячэнне ад алкагалізму. Ездзіў на невялікі тэрмін на работу ў Маскву, пасля чаго некалькі тыдняў не «прасыхаў». А свае провады ў армію адзначаў два тыдні. У рэшце рэшт хлопца прыйшлося адправіць на лячэнне.

З прычыны алкагольнай залежнасці не прызнаны годнымі да службы 354 прызыўнікі, і гэтая лічба павялічваецца. У некаторых раёнах яна выросла ў два разы. Аляксандр Вянсковіч лічыць, што гэту праблему нельга замоўчваць.

СТАР. 7

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

## «Чытаеш па-беларуску — і быццам гаворыш на роднай мове»

**Віктар РОІК, старшыня Воранаўскага раённага Савета дэпутатаў:**

Жывучы ў Беларусі, мы абавязкова павінны карыстацца сваёй мовай. Мая ўнучка-падлетак усё лета чытала па-беларуску, і на дапамогу ёй акрамя кніг прыходзіла, часам, і «Звязда». Я сам у свой час 9 класаў скончыў па-беларуску, а пасля жыццёвыя абставіны вымусілі мяне пераключыцца на рускую мову. Аднак у душы любоў да беларускай мовы засталася і будзе ў ёй, і «Звязда» дапамагае яе захоўваць. Чытаеш па-беларуску — і быццам гаворыш на роднай мове.

Сама па сабе газета цікавая, і падача матэрыялу асаблівая, толькі ёй уласцівая. «Звязда» мае свой уласны каларыт. У выданні шмат тэматычных укладак, але мне з прафесійнай пазіцыі вельмі карыснай здаецца «Мясцовае самакіраванне». Але тут жа вам і пра жывёл, і пра агарод. Часам, нешта і выразаю, бо інфармацыя заўжды актуальная.

І каманда ў «Звяздзе» падабралася прыстойная, цікавая. Чытаеш, і бачыш асобу кожнага, пазнаеш яго почырк, ведаеш уласныя цікавыя пазіцыі, меркаванні асобных аўтараў. Часам, хочацца з імі і паспрачацца, і пагадзіцца, але не застаешся раўнадушным ні да манеры выкладання, ні да саміх матэрыялаў.

Прыгажосць кожнай мясцовасці журналісты падкрэсляць, прафесійна і прыгожа выкладуць, і за гэтае ўменне, за тое, як яны паказваюць народныя традыцыі, вельмі паважаю газету. Чытаю — проста радуюся.

Калі прыязджаюць вашы карэспандэнты да нас на раён і размаўляюць з людзьмі, а пасля я іх сустракаю дзесьці, то адразу гаворка заходзіць пра «Звязду», успамінаюць. Не раз бачыў, як журналісты гутараць з мясцовымі, як стараюцца ўнікнуць у праблему, каб кожны штрышок заўважыць і перадаць.

Малайцы, так і працягвайце, на тым жа ўзроўні! Любім вас за вашу своеасаблівасць і прафесіяналізм, за спрадвечную беларускую мову.

# Палітыкі на лёдзе

**Кіраўнік дзяржавы сустрэўся з гульцамі і трэнерамі хакейнага клуба «Дынама—Мінск»**

**На днях каманда клуба сыграла не вельмі добра, і многія чакалі жорсткай размовы. Але ўсё атрымалася па-іншаму. Кіраўнік дзяржавы проста выканаў сваё ранейшае абяцанне — сустрэцца з гульцамі і трэнерамі клуба.**

## Перш за ўсё — каманда

— Чаму я хацеў перагаварыць з вамі ў пачатку сезона? Я хачу, каб вы з маіх вуснаў пачулі некалькі важных момантаў, — растлумачыў Аляксандр Лукашэнка.

У першую чаргу ён нагадаў пра тое, што хакей займае адно з вядучых месцаў у сістэме беларускага спорту. І зусім не таму, што кіраўнік дзяржавы — сам аматар гэтай гульні:

— Усе чамусьці гэта звязваюць з тым, што я з клюшкай коўзаюся па лёдзе. Я хачу, каб вы выразна разумелі: я не пазіцыяную сябе як хакеіста. Калі казаць пра маё спартыўнае крэда, я зусім не хакеіст, а футбаліст. Так склалася, што атрымаўшы траўму калена, я стаў займацца хакеем.

— Хакей — гэта калектыўная гульня, гэта вялікая ідэалогія, — падкрэсліў беларускі лідар. — Спорт увогуле — ідэалогія. Вышэй за спорт складана прыдумаць нейкія ідэалагічныя мерапрыемствы. Таму што глядзяць спартыўныя спаборніцтвы мільёны, а ў свеце — мільярды людзей. І калі каманда выйграе, калі каманда годна выступае, не трэба народ агітаваць на нешта, дух узнімаецца. У савецкія часы падлічвалі, што прадукцыйнасць працы пасля таго, як хакейная каманда выйгравала, паднімалася значна. Вось сутнасць спорту, і я гэта вельмі разумею, ацэньваю і прызнаю.

Асноўны спонсар айчыннага хакея — дзяржава. Але, падкрэсліў Прэзідэнт, — грошы ў гульні — далёка не самае галоўнае. Галоўнае — людзі, балельшчыкі і адказнасць перад імі каманды.

— Думаю, вам не трэба расказваць, з якім настроем яны сыходзяць, калі вы прайграяце, а яшчэ горш, калі вы не паказваеце нармальнай гульні, — адзначыў кіраўнік краіны. — Я часта спартсменам кажу сёння: спорт — гэта не барацьба. Сёння спорт — гэта вайна, якая набыла характар палітычны. І вы таксама, хочаце гэтага ці не, становіцеся вельмі моцнымі палітычнымі гульцамі. Вось гэта галоўнае, што я хацеў давесці да вас. Я вас вельмі прасіў бы, каб вы цанілі настрой, той боль, які перажываюць вашы сапраўдныя балельшчыкі, калі вы дрэнна гуляеце.

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў:

— Каманды пакуль, на жаль, няма. Сказаць, што вы ўвогуле нічога не можаце, я не магу. Вы можаце іграць, але гульня абсалютна няроўная, не камандная. Думаю, галоўная тут прычына ў тым, што вы не гатовыя перш за ўсё псіхалагічна.

Кіраўнік дзяржавы заклікаў гульцоў як мага хутчэй стаць сапраўдным арганізмам, камандай. Ён паабяцаў, што калі гульня будзе сапраўды добрай, дзяржава для каманды не пашкадуе нічога.

## Грошы — за вынік

Асобна — пра матэрыяльныя пытанні, якія, як правіла, выклікаюць найбольшую цікавасць. Кіраўнік дзяржавы нядаўна агучваў гэты тэзіс у тым ліку і ў Нацыянальным алімпійскім камітэце. Учора паўтарыў яшчэ раз: грашовыя выплаты спартсменам і трэнерам павінны быць прывязаны да канкрэтнага выніку. Усе, хто працуе ў камандзе і на каманду, не павінны быць пакрыўджаны, упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

— Мы выбудавалі сістэму матэрыяльнага і грашовага забеспячэння хакеістаў. Гэта будзе ў любым відзе спорту, гульнявым перш за ўсё, — адзначыў Прэзідэнт. — Асноўныя кантракты і зарплата будуць у «Дынама» і тых, хто гуляе за нацыянальную зборную. Там будуць прыстойныя грошы. Усе астатнія павінны зарабляць у клубах столькі, каб нармальна працаваць, таму што спорт — гэта праца, і нармальна жыць, таму што сем'і ёсць. Але не 19 тысяч долараў у месяц, як некаторыя трэнеры мелі сярэднюю зарплату па мінулым сезоне, не займаючы першага месца.

Па новай сістэме, калі хакеіст у экстралізе заняў першае месца, то яго гадавая зарплата павінна, напрыклад, падвоіцца.

— За першае месца — 100-працэнтнае павелічэнне. За другое, дапусцім, 80%. За трэцяе месца — 60% і гэтак далей. Але ўсё будзе нацэлена на вынік. Нельга плаціць усім пароўну. Гэта крыўдзіць лепшых спартсменаў, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Грошы трэба зарабляць і адпрацоўваць. Такі мой прынцыповы падыход.

Калі грошы зароблены за кошт нейкіх іншых відаў дзейнасці, спонсарскіх сродкаў, то яны будуць належаць выключна клубу і іх можна будзе накіроўваць у тым ліку на матэрыяльнае стымуляванне.

— Гэта вашы грошы, і вы, калі ласка, аддайце камандзе, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — І падзяліце паміж сабой. Гэта вашы грошы, ніхто да іх не дакранецца. Я вам публічна пра гэта кажу.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *margo@zviazda.by*

■ Падрабязнасці

# ПЕДАГАГІЧНЫЯ ПРАФЕСІІ БУДУЧЫНІ:

## цьютар, медыятар і праекціроўшчык адукацыйных рэсурсаў

**Прапанова даваць педагогам на час работы над падручнікамі творчы адпачынак з захаваннем заработнай платы была агучана падчас Рэспубліканскага педагагічнага савета з удзелам кіраўніка дзяржавы.**

— Гэта дазволіла б істотна скараціць працэс падрыхтоўкі новых падручнікаў і станоўча адбілася б на іх якасці, — лічыць **старшыня Мінскай гарадской арганізацыі Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Ларыса ВОЛКАВА**.— Акрамя таго, мы гатовы разам з сацыяльнымі партнёрамі прадумаць шэраг дадатковых мер, якія стымулявалі б настаўнікаў-практыкаў удзельнічаць у гэтым працэсе...

— Для мяне падручнік — гэта ікона. Добры падручнік плюс добры настаўнік — гарантыя таго, што любы вучань атрымае веды. І я настойваю, каб добра заплацілі за добры падручнік: хоць настаўніку, хоць акадэміку. А тыя ўжо няхай самі вырашаюць: пакінуць ім асноўную работу і працаваць толькі над падручнікам ці сумяшчаць. Калі вам добра заплацяць, вы будзеце свабодныя ў сваім выбары. Педагогам трэба даць магчымасць выбару, — падзяліўся сваім бачаннем сітуацыі па ўзнятай праблеме **Прэзідэнт нашай краіны Аляксандр ЛУКАШЭНКА**. — А калі мы прыцягваем да работы над падручнікам настаўніка-практыка — гэта доказ яго найвышэйшага ўзроўню. І плаціць яму трэба па заслугах.

На вялікім педагагічным савеце з удзелам кіраўніка дзяржавы абмяркоўваліся самыя злабадзённыя праблемы адукацыі — сацыяльны статус настаўніка, якасць падрыхтоўкі педагагічных кадраў у краіне, сістэма павышэння кваліфікацыі педагогаў, высокая загружанасць настаўнікаў, гатоўнасць установ адукацыі да новага навучальнага года.

Тэму якасці падручнікаў узняла ў сваім выступленні перад удзельнікамі нарады і **настаўнік гісторыі і грамадазнаўства з сярэдняй школы №1 Лагойска Зоя ВІНАГРАДАВА**:

— Нацыянальнаму падручніку ўжо больш як 20 гадоў. І калі першыя нацыянальныя падручнікі нярэдка былі вялікія па аб'ёме, складаныя для ўспрымання, не мелі ілюстрацый і картаў, то навучальныя дапаможнікі новага пакалення прыкметна змяніліся ў лепшы бок як па змесце, так і па паліграфічных якасцях. Я хацела б спыніцца на вартасцях сучасных падручнікаў па гісторыі: яны ўтрымліваюць больш якасны метадычны апарат з сістэмай пытанняў і заданняў, што дазваляе якасна арганізаваць дзейнасць вучняў па засваенні вучэбнага матэрыялу з улікам таго, што ў класе вучацца дзеці з рознымі адукацыйнымі магчымасцямі і запытамі, а таксама розным інтарэсам да вывучэння прадмета.

Але працэс удасканалення зместу адукацыі, на думку педагога, пастаянны. У жыццё ўступае новае пакаленне, якое па-іншаму думае, па-іншаму ўспрымае інфармацыю. Таму і падручнікі змяняюцца: прыярытэт за кароткімі, добра структураваным тэкстамі, з інфаграфікай, багатым ілюстрацыйным матэрыялам, які дапаўняе навучальны тэкст.

— Ведаю, што кардынальна змяніліся падручнікі па матэматыцы для 5-га класа, алгебры, геаметрыі, фізіцы для 7-га класа і г. д, дзе ў склад аўтарскіх калектываў увайшлі школьныя настаўнікі. Іх працу складана пераацаніць, як і важнасць экспертызы дзеючых падручнікаў і навучальных дапаможнікаў, — падкрэсліла Зоя Вінаградава. — Хацелася б адзначыць, што стварэнне добрага, якаснага падручніка — дастаткова доўгі і складаны працэс. Можна яго скараціць, але ці будзе вынік такім, якім мы яго хацелі б бачыць? Ці не спатрэбіцца потым дарабляць, перарабляць і ўдакладняць... І тут мы падыходзім, мабыць, да самага важнага. І з вучэбнай праграмай, і з падручнікам працуе настаўнік. І менавіта ад яго прафесіяналізму залежыць, наколькі даступна, цікава і зразумела ён зможа растлумачыць самую складаную тэму. З'явілася пакаленне, якое выросла ў свеце бязмежнай інфармацыі. У іх сфарміраваліся новыя адукацыйныя патрэбы і запыты. І яны гатовыя вучыцца па-іншаму. Але што мы можам ім прапанаваць?

**«Вярнуцца да пяцібальнай сістэмы ацэнкі — гэта прыкладна тое ж самае, што паляцець у космас на старым возе».**

Сёння важна навучыць дзіця працаваць з рознымі крыніцамі інфармацыі. Але для гэтага трэба навучыць і настаўніка, у залежнасці ад спецыфікі вучэбнага прадмета, прыёмам фарміравання ў вучняў некалі вельмі папулярных, а цяпер забытых агульнавучэбных уменняў і навыкаў. І калі на кожным уроку вучань будзе асвойваць прыёмы пошуку і работы з інфармацыяй, прыёмы яе апрацоўкі, аналізу, то на выхадзе са школы мы атрымаем не чалавека-«камп'ютара», які трымае ў галаве ўсе факты, лічбы, правілы, а чалавека мабільнага, гнуткага, грамадзяніна сваёй краіны.

На думку настаўніцы, педагогам сёння патрабуецца веданне псіхалогіі, уменне арганізоўваць работу ў камандзе, кампетэнтна ацэньваць мэтазгоднасць выкарыстання тых ці іншых адукацыйных тэхналогій з пункту гледжання іх уплыву на здароўе навучэнцаў. Напэўна, гэта задача для педагагічных ВНУ і сістэмы павышэння кваліфікацыі педагогаў. «Пры распрацоўцы новых падручнікаў выкарыстоўваюцца сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі, з'явіліся падручнікі з інтэрактыўнымі магчымасцямі. Аднак, на жаль, у гэтым пытанні вучні нас ужо абышлі, таму ў сістэме павышэння кваліфікацыі трэба ўдзяліць сур'ёзную ўвагу інфармацыйна-камунікацыйнай адукаванасці настаўнікаў, — упэўнена педагог. — Калі раней актуальнымі былі пытанні «Чаму вучыць?» і «Як вучыць?», то сёння да іх дадаліся новыя «Каго вучыць?» і «Для чаго вучыць?».

— Якія б структурныя змяненні ні адбываліся, усё роўна галоўным гарантам забеспячэння якасці адукацыі з'яўляецца педагог: вельмі шмат залежыць ад яго ўмення «запаліць» вучня, дапамагчы яму раскрыць і рэалізаваць свой патэнцыял, — лічыць **рэктар Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы Андрэй КАРОЛЬ**. — Для гэтага мы распрацоўваем і ўкараняем у навучальны працэс сучасныя тэхналогіі навучання, арыентаваныя на развіццё пазнавальных, крэатыўных, рэфлексіўных якасцяў асобы студэнтаў, паслядоўна рэалізуем праграму ўдасканалення педагагічнага майстэрства як для выкладчыкаў універсітэта, так і для школьных настаўнікаў праз правядзенне семінараў з агульнай назвай «Як вучыць ўсіх па-рознаму, але аднолькава».

На думку рэктара, трэба павышаць і ролю выпускнікоў магістратуры, якія здольныя больш эфектыўна вырашаць нестандартныя прафесійныя задачы: «У гэтай сувязі даўно наспела неабходнасць унесці змены ў Адзіны кваліфікацыйны даведнік пасад служачых. Напрыклад, толькі педагогі, якія маюць ступень магістра, павінны выкладаць у профільных класах, займаць кіруючыя пасады».

Звярнуў увагу Андрэй Кароль яшчэ на адну актуальную праблему. «Універсітэт у рэгіёне — гэта своеасаблівы фарпост краіны на яе межах. Мушу канстатаваць, што ў апошнія гады ў суседніх з намі замежных універсітэтах мэтанакіравана адкрываюцца праграмы бясплатнага навучання на рускай мове. Таму ўніверсітэты, размешчаныя ў рэгіёнах Беларусі, павінны прадухіліць пагрозу адтоку таленавітай моладзі з краіны і стварыць умовы для самарэалізацыі кожнага маладога грамадзяніна нашай рэспублікі на сваёй радзіме», — заўважыў ён.

Напярэдадні пленарнага пасяджэння ў рамках рэспубліканскага педсавета прайшлі восем профільных секцый. На адной з іх даволі бурна абмяркоўвалася магчымае вяртанне да пяцібальнай сістэмы. Меркаванне абсалютнай большасці прысутных было на карысць захавання дзесяцібальнай сістэмы. Спрачаючыся з прыхільнікам «пяцібалкі», **заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь, метадыст Акадэміі паслядыпломнай адукацыі Ганна ДАБРЫНЕЎСКАЯ** зазначыла: «Вяртанне да пяцібальнай сістэмы ацэнкі — гэта прыкладна тое ж самае, што паляцець у космас на старым возе. Час іншы, дзеці іншыя, патрабаванні іншыя. І мы не проста веды павінны ім даць, а ўніверсальныя кампетэнцыі. Вяртацца назад катэгарычна нельга. Гэта шараханне, гэта спыненне, тормаз, а мы не павінны быць тормазам для сваёй сістэмы, не павінны замаруджваць рух да поспеху нашых вучняў».

### ЯКІЯ ЯШЧЭ ПРАПАНОВЫ БЫЛІ АГУЧАНЫ ПАДЧАС РАБОТЫ СЕКЦЫЙ:

— Адкрыць падрыхтоўку па сучасных педагагічных спецыяльнасцях.

Ужо падрыхтаваны праекты адукацыйных стандартаў пакалення 3+. Іх асаблівасць у прафілізацыі, якая дае магчымасць аператыўна адкрываць новыя запатрабаваныя педагагічныя спецыяльнасці, такія, як ц'ютар, медыятар, праекціроўшчык адукацыйных рэсурсаў і іншыя.

— Даць магчымасць атрымліваць абітурыентам мэтавае накіраванне на любым прадпрыемстве. Сутнасць навацыі ў тым, што ўзяць мэтавае накіраванне можна будзе ў любой арганізацыі незалежна ад месца яе размяшчэння. Цяпер атрымаць можна толькі ў сельскіх населеных пунктах ці населеных пунктах, дзе пражывае менш за 20 тысяч чалавек. Акрамя таго, мэтавае накіраванне даюць прадпрыемствы, размешчаныя на тэрыторыі радыеактыўнага забруджвання.

— Змяніць сістэму пастаноўкі на ўлік у дзіцячыя садкі. У прыватнасці, гаворка ідзе аб выключэнні працэдуры з пераліку адміністрацыйных працэдур, што ажыццяўляюцца дзяржаўнымі органамі, што дасць магчымасць спрасціць працэс афармлення дзіцяці ў дзіцячую дашкольную ўстанову. Асабліва гэта актуальна для жыхароў сельскай мясцовасці, якім неабходна для пастаноўкі на ўлік ехаць за дзясяткі кіламетраў у горад.

— Фінансаваць частку выдаткаў прыватных устаноў дашкольнай адукацыі за кошт бюджэтных сродкаў (зыходзячы з колькасці дзяцей, якія накіроўваюцца туды мясцовымі органамі ў выпадку адсутнасці свабодных месцаў у дзяржаўных дзіцячых садках).

— Адкрываць групы для дзяцей дашкольнага ўзросту на першых паверхах шматкватэрных дамоў у мікрараёнах-новабудоўлях з наступным іх выкарыстаннем пад іншыя мэты (магазін, аддзяленне банка і г. д.)

— Аптымізаваць віды ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

— Ствараць навукова-адукацыйна-вытворчыя кластары для забеспячэння якасці падрыхтоўкі прафесіяналаў, якія займаліся б распрацоўкай прафесійных стандартаў, укараненнем перадавых галіновых тэхналогій, незалежнай экспертызай якасці адукацыі і аналізам рынку працы і дынамікі працоўных рэсурсаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

■

■ Заробкі

# ПЛЮС ДВА РУБЛІ

## Тарыфная стаўка першага разраду павялічыцца

**З 1 верасня тарыфная стаўка першага разраду для аплаты працы работнікаў бюджэтных арганізацый і прыроўненых да іх вырасце на 6,5 працэнта — з 31 да 33 рублёў. Пры гэтым памеры карэкціруючых каэфіцыентаў, штомесячных дыферэнцаваных даплат не зменяцца.**

Рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання, мясцовым выканаўчым і распарадчым органам, кіраўнікам бюджэтных арганізацый даручана пералічыць заробкі работнікаў у адпаведнасці з новай тарыфнай стаўкай і каэфіцыентамі. Змены закрануць 859,2 тысячы чалавек — столькі беларусаў, па звестках Белстата, працуе ў бюджэтнай сферы.

Апошні раз стаўка тарыфнага разраду павышалася 1 студзеня гэтага года. Тады ж былі ўстаноўлены штомесячныя дыферэнцаваныя даплаты работнікам бюджэтных арганізацый, тарыфікуемых 1—14 разрадамі, у памерах 8,6—5,7 рубля.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

■ Будзь у курсе!

## Ці ўсё вас задавальняе ў аптэцы?

Праходзіць экспрэс-маніторынг рынку лекавых сродкаў

**Для яго правядзення (цэны, даступнасць, наяўнасць) у Міністэрстве антыманапольнага рэгулявання і гандлю па 18 верасня адкрыта гарачая лінія.**

Па тэлефоне (8 017) 200 92 02 грамадзяне могуць паведамляць аб фактах росту цэн, розных цэнах на адны і тыя ж лекі ў розных аптэках (з указаннем суб'ектаў гаспадарання, іх адраса), іх адсутнасці ў продажы, а таксама аб іншых праблемных пытаннях адносна забяспечанасці насельніцтва лекавымі сродкамі. Юрыдычныя асобы могуць паведамляць аб праблемных пытаннях, што маюцца, у плане вязення бізнесу ў фармакалагічнай галіне. Кожны факт будзе вывучаны, абяцаюць у Міністэрстве антыманапольнага рэгулявання і гандлю. Пры неабходнасці будуць прыняты меры ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Рэжым работы гарачай лініі: у рабочыя дні з 9.00 да 13.00 і з 14.00 да 18.00.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Жніво-2017

# МІЛЬЁН І ЯШЧЭ 74 ТЫСЯЧЫ

**...тон збожжа — такі вынік сёлетняга жніва на Магілёўшчыне.**

Магілёўскія аграрыі паспелі завяршыць уборачную кампанію яшчэ да таго, як на вобласць абрушыўся дождж. Шклоўскі раён стаў абсалютным лідарам і па ўраджайнасці — 78,8 цэнтнера з гектара (ААТ «Александрыйскае»), і па колькасці сабранага ўраджаю — 133,6 тысячы тон. На другім месцы Магілёўскі раён з ураджайнасцю 74,5 (ЗАТ «Агракамбінат «Зара») і 124,4 тысячы тон збожжа. Болей чым па 65 цэнтнераў з гектара збіралі аграрыі аграгаспадарак «Калгас «Радзіма» Бялыніцкага раёна і «Кастрычнік» — Мсціслаўскага.

Першымі ў краіне пяць тысяч тон збожжа намалацілі экіпажы камбайнераў ЗАТ «Агракамбінат» Зара» — бацька і сын Уладзімір і Вадзім Корсакі, а таксама Уладзімір Мельнікаў і Аляксей Макосаў. Столькі ж збожжа перавезлі ад камбайнаў кіроўцы гэтага аграпрадпрыемства Юрый Манкевіч і Хасія Лангуры. Па пяць тысяч тон збожжа перавезена і кіроўцамі Шклоўскага раёна Віталем Цемруком (ЗАТ «Амкадор-Шклоў») і Ігарам Ярашовым ААТ «Александрыйскае».

Але тэмп сельскагаспадарчых работ на Магілёўшчыне не зніжаецца. Як паведамілі ў камітэце па сельскай гаспадарцы і харчаванні Магілёўскага аблвыканкама, зараз поўнай хадой ідзе ўзорванне зяблева пад азімыя, пасеў азімага рапсу, уборка бульбы.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

■ Фестывалім

# ДА РАДЗІМІЧАЎ — У ГОСЦІ

**...запрашае на гэтыя выхадныя Чавускі раён. У аграгарадку Радамля прапануюць перанесціся на некалькі стагоддзяў назад — у старажытны горад радзімічаў.**

Эпоху будуць ствараць тэатралізаваны наказ «Падарожжа ў сівую даўніну», паказальныя баі вікінгаў перыяду ранняга Сярэднявечча, этнатанцы і іншыя забавы. Настрой святу зададуць гурты з Мінска «Хмяльны Вір», «HardWood», дуэт беларускай і сярэднявечнай музыкі «Дзівабор».

Нагадаем, што ініцыятыва «Радамля — старажытны горад радзімічаў» рэалізуецца Праграмай развіцця ААН у рамках праекта «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь» і фінансуецца Еўрапейскім саюзам. Спонсарскую падтрымку атрымала і ініцыятыва «Экалагічны турызм для развіцця патэнцыялу Чавускага раёна», што дапамагло распрацаваць пазнавальны водна-пешы маршрут Новаягораўка — крыніцы Байкава.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

■ Футбол

# АМАЛЬ ЯК У КІНО

**Футбалісты БАТЭ прабіліся ў групавы раўнд Лігі Еўропы**

**Гэта стала магчыма дзякуючы таму, што барысаўчане па суме дзвюх сустрэч абыгралі ўкраінскую «Александрыю».**

Нагадаем, першы матч на «Барысаў-Арэне» скончыўся з лікам 1:1, а вось на поле ўкраінскага клуба падапечныя Аляксандра Ермаковіча вырвалі перамогу ў «Александрыі» — 2:1. Хоць пачатак гульні склаўся зусім няўдала: пасля парушэння правілаў Станіславам Драгуном у штрафной плошчы пенальці рэалізаваў украінец Васіль Грыцук. Аднак стараннямі Мірка Іваніча БАТЭ вярнуўся ў гульню, першы раз ён паразіў вароты на 70-й хвіліне, а праз тры хвіліны аформіў галявы дубль.

*— Для нас матч склаўся. Сцэнарый у яго быў амаль як у кіно. Няўдалы пачатак і шчаслівы канец, — адзначыў* **галоўны трэнер БАТЭ Аляксандр Ермаковіч.** *— Цяжка ўваходзілі ў гульню. У першым тайме «Александрыя» дамінавала, стварыла больш момантаў, аказвала ціск. Вельмі рады, што здолелі перамаць гульню. Каманда праявіла характар, я ганаруся іх дзеяннямі ў другім тайме. Мы вельмі задаволеныя: у няпросты час перамагчы і выйсці ў групу — дарагога варта.*

Тым часам у Манака адбылася жараб'ёўка групавой стадыі Лігі Еўропы — 2017/18. Барысаўскі БАТЭ выступіць у квартэце Н, дзе пазмагаецца з лонданскім «Арсеналам», нямецкім «Кёльнам» і «Црвенай Звездай» з Бялграда. Гульні групавога этапу пачнуцца 14 верасня і скончацца 7 снежня.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

■ Ведай нашых!

# ЗОЛАТА НА ДЫВАНЕ

Ванеса Каладзінская стала чэмпіёнкай свету па спартыўнай барацьбе

**Планетарны форум праходзіць у гэтыя дні ў Парыжы. У вагавай катэгорыі да 53 кг Ванеса спачатку ўпэўнена адолела Юлію Леорду з Малдовы, у наступным раўндзе беларуска не пакінула шанцаў Марыі Прэваларакі з Грэцыі, на стадыі паўфіналу была мацнейшай за Эстэр Добрэ з Румыніі і нарэшце ў фінале Каладзінская адолела Маю Мукаіду з Японіі.**

Нагадаем, што ў гэтым сезоне Ванеса стала чэмпіёнкай Еўропы ў Сербіі, таксама ў яе актыве ўжо ёсць залаты медаль чэмпіянату свету ў 2012 годзе.

Узнагарода Ванесы Каладзінскай стала першай залатой у скарбонцы беларускай каманды на сусветным форуме. Усяго ж на рахунку нашых спартсменаў ужо чатыры медалі. Раней прадстаўнік грэка-рымскага стылю Радзік Куліеў (80 кг) стаў сярэбраным прызёрам. Другое месца ў катэгорыі 75 кг заняла Васіліса Марзалюк, бронзавы медаль у Ірыны Курачкінай (55 кг).

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*


**РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о повторном открытом аукционе по продаже административно-хозяйственного здания, г. Минск, пр-д Бетонный, 13**

Лот №1. Здание административно-хозяйственное с инв. №500/С-5079. Назначение: здание административно-хозяйственное. Г.п. – 1949; Этажность – 2; Общая площадь – 634,2 кв. м. Фундамент – бетонный; Стены наружные и внутренние – кирпичные; Перегородки – кирпичные; Перекрытия – деревянные; Крыша – металлический профнастил; Полы – дощатые, плиточные, линолеумные, ламинат; Проемы оконные – двойные деревянные, стеклопакеты; Проемы дверные – филенчатые, щитовые; Наружная отделка – оштукатурено, окрашено; Внутренняя отделка – окрашено, облицовано, оклеено обоями; Отопление – есть; Водопровод, канализация – есть; Электроснабжение – скрытая проводка; Вентиляция – естественная.

**Начальная цена продажи – 325 620,00 бел. руб.**
**Задаток – 32 560,00 бел. руб. Шаг аукциона 5%**

СВЕДЕНИЯ О ЗЕМЕЛЬНОМ УЧАСТКЕ

Земельный участок с кадастровым номером 500000000005001831, расположенный по адресу: г. Минск, пр-д Бетонный, 13, пл. 0,0955 га. Назначение – эксплуатация и обслуживание административного здания. Право постоянного пользования.
ОБРЕМЕНЕНИЯ: охранная зона водовода, пл. 0,0955 га; обеспечение доступа для производства ремонтно-восстановительных работ эксплуатирующим организациям владельцам инженерных коммуникаций, пл. 0,0955 га

ОБРЕМЕНЕНИЯ

1. Ипотека. В случае продажи с публичных торгов имущества, являющегося предметом ипотеки, ипотека прекращается в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
2. Запрещение. Запрет на отчуждение на основании постановления ОПИ Московского района города Минска от 05.04.2017 №б/н.
3. Запрещение. Запрет совершения регистрационных действий на основании постановления ОПИ Московского района города Минска от 18.08.2017 №б/н.
4. Арест. Постановление ИМНС Республики Беларусь по Московскому району г. Минска от 11.08.2016 №001927. Арест будет снят в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь после реализации Объекта с публичных торгов (торгов)

УСЛОВИЯ

1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объекты по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) (Претендент на покупку), обязан оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе имущества не позднее 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола аукциона.
2. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
3. Переход права собственности на приобретенный на аукционе Объект недвижимости, имущество должника, осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 22.09.2017 г. в 11.00 по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X.
Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества (Лот №1), проводимом 22.09.2017 (Фрунзенский МРО).
Организация и проведение аукциона, а также оформление и регистрация сделки осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в г. Минске, ул. Комсомольская, 11, каб. 7 в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00. Окончание приема заявлений – 20.09.2017 в 11.00.
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами аукциона. Контактное лицо для осмотра Объектов: ген. директор ОАО «Спецремонт» Федосенко Виктор Михайлович 8-017-213-62-05; 8-017-208-27-17

Контакты организатора аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 550 09 52, 8 (029) 550 09 59, 8 (029) 356-90-03 • www.ino.by • torgi@ino.by


# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## Крушэнне двух паромаў у Бразіліі прывяло да шматлікіх чалавечых ахвяр

У Бразіліі расце колькасць загінулых людзей у выніку крушэння двух пасажырскіх паромаў.

Як паведамляюць інфармагенцтвы, ахвярамі двух надзвычайных здарэнняў на вадзе сталі 41 чалавек. Першая трагедыя адбылася 23 жніўня. Тады ў штаце Пара на поўначы краіны затануў паром. На яго борце знаходзілася 70 чалавек, у тым ліку экіпаж. У выніку загінулі 19 чалавек, 23 удалося выратавацца, яшчэ 7 прапалі без вестак. Устаноўлена, што судна не мела дазволу на перавозку пасажыраў. Другая трагедыя адбылася напярэдадні на ўсходзе Бразіліі. Судна, якое рухалася з Мар-Грандзі ў Салвадор, перавярнулася ў заліве Тодус-ус-Сантас. Са 130 пасажыраў, якія знаходзіліся на борце, 22 чалавекі загінулі, 21 быў выратаваны. Пошукава-выратавальная аперацыя працягваецца.

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста выказаў спачуванні Прэзідэнту Бразіліі Мішэлу Тэмеру, а таксама родным і блізкім загінулых у выніку караблекрушэнняў на рацэ Амазонка і ў Атлантычным акіяне.**

## Ахоўнікаў Пенса пакаралі за тое, што яны ўпотай правялі жанчын у гатэль

Некалькі амерыканскіх ваенных адхіленыя ад аховы Белага дома за праступак, учынены падчас нядаўняга лацінаамерыканскага турнэ віцэ-прэзідэнта ЗША Майкла Пенса. Гэтыя ваенныя ўпотай прывялі жанчын да сябе ў гатэль у Калумбіі, дзе павінен быў спыніцца віцэ-прэзідэнт, паведаміла тэлекампанія NBC.

Паводле яе звестак, парушэнне выявілі супрацоўнікі апарату віцэ-прэзідэнта ЗША, прагледзеўшы запісы камер відэаназірання ў гасцініцы.

Тэлекампанія ў гэтай сувязі нагадвае, што сакрэтная служба ЗША, якая забяспечвае бяспеку першых асоб дзяржавы, апошнім часам скаланае чарада гучных скандалаў, выкліканых непрыстойнымі паводзінамі яе персаналу, у тым ліку п'янства і сувязі з прастытуткамі, а таксама неналежнае выкананне службовых абавязкаў. Гэтыя здарэнні каштавалі пасады папярэдняму кіраўніку сакрэтнай службы Джуліі Пірсан.

## Амерыканка выйграла ў латарэю 759 мільёнаў долараў

Выйгрышны білет латарэі Powerball, джэкпот якой склаў 758,8 мільёна долараў, быў набыты ў прадуктовай краме ў горадзе Уотэртаўн (штат Масачусэтс). Гэта самы вялікі выйгрыш, які выпаў на адзін білет, у амерыканскай гісторыі, паведамляе CNN Moneny.

Пераможцай аказалася маці дваіх дзяцей Мэвіс Венца. Яна больш за 30 гадоў працавала ў шпіталі, але даведаўшыся, што разбагацела, адразу патэлефанавала свайму начальніку і сказала, што звальняецца. Што рабіць з такой кучай грошай, жанчына яшчэ не вырашыла. Пакуль хоча проста адпачыць.

Паводле звестак арганізатараў, выйгрышнымі нумарамі сталі 6, 7, 16, 23, 26, а бонус — лік 4. Яшчэ шэсць шчасліўчыкаў, нумары квіткоў якіх супалі з імі няпоўнасцю, выйгралі па 2 мільёны долараў, а 34 удзельнікі розыгрышу — па 1 мільёне.

Згодна з правіламі, пераможца можа атрымаць джэкпот часткамі на працягу 29 гадоў ці стаць яго ўладальнікам адразу. У апошнім выпадку сума выйгрышу становіцца прыкладна ў два разы меншай, без уліку памеру падаткаў.

Шанцы выйграць складаюць прыкладна 1 да 292 мільёнаў. Латарэя Powerball праводзіцца ў 44 штатах, федэральнай акрузе Калумбія, на амерыканскіх Віргінскіх астравах і ў Пуэрта-Рыка. Цана квітка складае 2 долары, а агульная выручка ад іх продажаў складае некалькі мільярдаў долараў.

Сумесны праект газеты «Звязда» і Міністэрства ўнутраных спраў

ФАРПОСТ СПАКОЮ

№8 (39)



■ Новы этап

**Урачысты рытуал адбыўся на плошчы Дзяржаўнага сцяга ў сталіцы. Сёлета курсантамі вядучай міліцэйскай ВНУ краіны сталі 512 маладых хлопцаў і дзяўчат. У страі — будучыя афіцэры Міністэрства ўнутраных спраў, дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю — фінансавай міліцыі, Следчага камітэта, Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз, Дзяржаўнага пагранічнага камітэта і Міністэрства абароны.**

# НА ВЕРНАСЦЬ РАДЗІМЕ І НАРОДУ

## Першакурснікі Акадэміі МУС прынялі прысягу

На цырымоніі прысутнічала кіраўніцтва Міністэрства ўнутраных спраў, супрацоўнікі Акадэміі, ветэраны міліцэйскай службы, родныя і блізкія будучых афіцэраў. З прывітальным словам да ўсіх звярнуўся **начальнік Акадэміі МУС, генерал-маёр міліцыі Уладзімір БАЧЫЛА:**

— У 2017 годзе міліцыя Беларусі адзначыла свой стагадовы юбілей. Перакананы, што застаючыся вернымі прысязе, вы зможаце пераняць слаўныя традыцыі і бясцэнны вопыт, назапашаны папярэднімі пакаленнямі афіцэрскага корпуса нашай Радзімы. Навучаючыся ў Акадэміі, вы не толькі атрымаеце веды па юрыдычных і гуманітарных дысцыплінах, але і станеце фізічна падрыхтаванымі і загартуеце свой характар. Прафесарска-выкладчыцкі і камандны склад прыкладзе ўсе намаганні, каб кожны стаў сапраўдным прафесіяналам і годным грамадзянінам, верным абавязку і Айчыне.

Гісторыя Акадэміі налічвае ўжо практычна 60 гадоў, за гэты час у сценах ВНУ прайшлі падрыхтоўку некалькі дзясяткаў тысяч афіцэраў-юрыстаў. Сярод выпускнікоў Акадэміі МУС — пяць міністраў унутраных спраў Беларусі, у тым ліку і цяперашні міністр, генерал-лейтэнант міліцыі Ігар Шуневіч.

Вучоба ў Акадэміі доўжыцца чатыры гады, працуюць факультэты: міліцыі, следча-экспертны, крымінальна-выканаўчы, навукова-педагагічны і факультэт права, таксама адкрыты факультэт павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіруючых кадраў.

Матэрыяльна-тэхнічнае абсталяванне ВНУ дазваляе атрымліваць не толькі тэарэтычныя веды, але і адпрацоўваць іх на практыцы, у тым ліку, засвойваць апошнія напрацоўкі ў сферы высокіх тэхналогій. Акрамя агульнай для ўсіх універсітэтаў сучаснай базы, у Акадэміі ёсць спецыяльныя пляцоўкі — крыміналістычныя палігоны, вучэбныя палігоны па розных кірунках аператыўна-службовай дзейнасці органаў унутраных спраў, фоталабараторыі і крыміналістычныя лабараторыі, кабінеты аўтамабільнай падрыхтоўкі і аўтадром. Нароўні з вучэбнай дзейнасцю міліцэйская Акадэмія, вядомая значнымі спартыўнымі дасягненнямі, а таксама правядзеннем міжнародных і рэспубліканскіх турніраў і конкурсаў, такіх як, напрыклад, Міжнародны конкурс аратарскага майстэрства «Цыцэроній», Міжнародны турнір па інтэлектуальных гульнях «Шчыт і меч», Міжнародны конкурс па правах бежанцаў «Новы гарызонт».

Сёлета конкурс у Акадэміі склаў каля двух чалавек на месца. Праверцы ведаў папярэднічаў сур'ёзны адбор па медыцынскіх паказчыках, які змог прайсці далёка не кожны, хто марыў аб службе ў праваахоўных органах. Тыя ж 500 чалавек, якія стойка вытрымалі ўсе іспыты, нарэшце ўчора з гонарам прамовілі словы прысягі. Павіншаваў іх са святочнай падзеяй і сказаў словы на дарогу **першы намеснік міністра ўнутраных спраў, начальнік крымінальнай міліцыі, генерал-маёр міліцыі Іван ПАДГУРСКІ:**

— Служба ў праваахоўных органах запатрабуе ад вас асаблівай прафесійнай падрыхтоўкі, стойкасці, вытрымкі і поўнай самааддачы. Вы людзі нялёгкай і мужнай прафесіі. Ва ўсе перыяды станаўлення нашай дзяржавы праваахоўныя органы цвёрда стаялі на варце законнасці і правапарадку. Народ Беларусі з вялікай павагай і даверам адносіцца да людзей у міліцэйскай форме, удзячны за тое, што заўсёды можа разлічваць на абарону, дапамогу і падтрымку.

Ужо з моманту залічэння ў Акадэмію курсанты з'яўляюцца супрацоўнікамі органаў унутраных спраў. Цэлы месяц да прыняцця прысягі яны правялі на вучэбным зборы, дзе спасцігалі азы міліцэйскай службы, вывучалі агульнавоінскія статуты, асновы агнявой, страявой, прафесійна-прыкладной фізічнай падрыхтоўкі і іншыя дысцыпліны. Для многіх гэты перыяд стаў першым працяглым расстаннем з блізкімі, што зрабіла цырымонію асабліва кранальнай. Бо ў родных і сяброў нарэшце з'явілася магчымасць абняць і асабіста павіншаваць будучых праваахоўнікаў з лёсавызначальным крокам у іх жыцці.

Вось і Людміла Быкава, мама аднаго з курсантаў, не змагла стрымаць эмоцыі, відаць, што хвалюецца яна значна больш за сына, які паступіў на факультэт міліцыі, спецыяльнасць аператыўна-вышуковая дзейнасць.

— Для мяне гэта вельмі прэстыжная, значная для грамадства прафесія. Менавіта таму я зрабіў такі выбар, а сям'я мяне цалкам падтрымала. Па першым часе на зборы было нязвыкла, нават хацелася дамоў, але цяпер, набраўшыся сіл і атрымаўшы першы вопыт, хочацца хутчэй прыступіць да вучобы. Мне здаецца, момант прысягі я запомню на ўсё жыццё: адчуў вялікую радасць, гонар і патрыятычны ўздым, — расказаў першакурснік Віталь Быкаў.

Па традыцыі падчас цырымоніі быў вынесены сцяг Акадэміі МУС. Ключар храма Аляксандра Неўскага Дзмітрый Харошка дабраславіў курсантаў і акрапіў іх святой вадой. Завяршыўся ўрачысты рытуал маршам маладых праваахоўнікаў

■

ПРАМАЯ ЛІНІЯ

**Кадравае забеспячэнне і праходжанне службы**

Сёння, 26 жніўня, намеснік міністра ўнутраных спраў па ідэалагічнай рабоце і кадравым забеспячэнні генерал-маёр міліцыі **Аляксандр Аркадзевіч Кобрусеў** правядзе прамую тэлефонную лінію па актуальных пытаннях кадравага забеспячэння і праходжання службы ў органах унутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

Пытанні можна будзе задаць **з 9.00 да 12.00** па тэл. (8-017) **218-55-30.**

■ Будзьце пільныя!

# КАЛІ «СЯБАР» АКАЗВАЕЦЦА ЗЛАЧЫНЦАМ

## Як у сацыяльных сетках не стаць ахвярай махляроў

**Сябар пазнаецца ў бядзе — менавіта па гэтым прынцыпе дзейнічаюць шматлікія інтэрнэт-злачынцы. Апошнім часам зламыснікі звярнулі асаблівую ўвагу на беларускіх карыстальнікаў папулярнай сацсеткі «УКантакце». Яны ўзломваюць акаўнты і ад імя іх уладальнікаў рассылаюць віртуальным сябрам паведамленні з просьбай аб фінансавай дапамозе.**

Людзі вядуцца на, здавалася б, прымітыўныя хітрыкі махляроў па некалькіх асноўных прычынах. Калі гаворка ідзе пра самых блізкіх, то мозг быццам бы адключаецца: адзінае жаданне — хутчэй выручыць чалавека, да якога ты неабыякавы, з бяды. Калі ж у падобную сітуацыю трапляюць проста знаёмыя, то спрацоўвае прынцып сораму: няёмка адмовіць чалавеку, тым больш гаворка ідзе не аб буйных сумах. Дарэчы, папрасіць могуць аб пераводзе невялікай сумы на карт-рахунак, электронны кашалёк, баланс мабільнага тэлефона, альбо спрабуюць даведацца рэквізіты банкаўскай аплатнай карты. Прычыны называюць розныя, але заўсёды прыстойныя і пераканаўчыя. Спасылаюцца, напрыклад, на раптоўнае блакаванне аплатнай карткі ці страту грошай і дакументаў падчас замежнай паездкі.

Толькі ў гэтым годзе зарэгістраваны ўжо 191 зварот з прычыны інтэрнэт-ашуканства, распачата 138 крымінальных спраў. Больш за ўсё такіх выпадкаў фіксуецца на Гродзеншчыне і ў сталіцы, найменшая іх колькасць — у Магілёўскай вобласці.

— Многія карыстальнікі, якія атрымалі падобныя пасланні, нават не дапускалі думкі, што з другога боку манітора знаходзіўся махляр, а не сапраўдны ўладальнік акаўнта, — расказаў **часова выконваючы абавязкі па пасадзе начальніка ўпраўлення па раскрыцці злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій крымінальнай міліцыі МУС Уладзімір ЗАЙЦАЎ.** — Гісторыі зламыснікаў здаюцца настолькі праўдзівымі, што людзі, якія хочуць дапамагчы знаёмаму ў цяжкай сітуацыі, паслухмяна выконваюць любыя ўказанні, цалкам губляючы пільнасць.

Яшчэ менш падазрэнняў узнікала ў тых, каму зламыснікі пісалі са «ўзламаных» старонак віртуальных сяброў і прапаноўвалі паведаміць рэквізіты банкаўскіх картаў. Грамадзянам тлумачылі, што іх даныя неабходныя для пераводу сродкаў на аплату пакупак, мабільнай сувязі і іншых паслуг. Просьбіт запэўніваў, што ніяк не можа зрабіць усё гэта сам, бо знаходзіцца за мяжой або страціў доступ да свайго інтэрнэт-банкінгу.

Нядаўна ўступіў у законную сілу прысуд суда Ленінскага раёна г. Гродна ў дачыненні да жыхара Століна Брэсцкай вобласці, які менавіта такім чынам завалодаў 154 мільёнамі недэнамінаваных рублёў. Узломваць чужыя акаўнты 16-гадовы хлопец пачаў яшчэ ўвосень 2015 года. Супрацоўнікі міліцыі ўстанавілі больш за 300 эпізодаў яго злачыннай дзейнасці. У выніку хакер прысуджаны да трох гадоў пазбаўлення волі з адтэрміноўкай выканання пакарання.

— Каб не даць сябе падмануць, заўсёды варта перапраўраць інфармацыю падобнага роду, — раіць Уладзімір Зайцаў. — Перш чым пераводзіць грошы па просьбе знаёмага, высветліце, ці сам ён адпраўляў вам падазроныя паведамленні. Напрыклад, звяжыцеся з гэтым чалавекам па тэлефоне. Калі патэлефанаваць немагчыма, задайце яму некалькі кантрольных пытанняў, адказы на якія немагчыма атрымаць, вывучыўшы звесткі на вашай і яго старонках у сацыяльнай сетцы, а таксама з іншых адкрытых крыніц. Акрамя таго, ніколі і нікому не паведамляйце рэквізіты сваёй банкаўскай аплатнай карты. Не фатаграфуйце яе вонкавы і адваротны бок, не распаўсюджвайце гэтыя здымкі ў інтэрнэце

■

■ Павышаная ўвага

# НА ДАРОГУ — З ПАШПАРТАМ

## Для школьнікаў распрацуюць бяспечныя маршруты

**У новым навучальным годзе ва ўсіх установах адукацыі з'явяцца спецыяльныя дакументы — пашпарты, якія будуць спрыяць папярэджанню дарожна-транспартнага траўматызму сярод непаўналетніх.**

### На стэндах і ў дзённіках

У пашпарце можна будзе знайсці інфармацыю аб месцазнаходжанні дзіцячага садка ці школы, колькасці навучэнцаў, часе пачатку і заканчэння заняткаў, наяўнасці куткоў і цэнтраў па бяспецы дарожнага руху, аўтагарадкоў або аўтапляцовак, кантакты замацаваных за ўстановай адукацыі супрацоўнікаў Дзяржаўтаінспекцыі і атрадаў юных інспектараў дарожнага руху. Тут жа будуць змешчаныя і не менш важныя даныя аб стане агароджы тэрыторыі, наяўнасці прылад, якія зачыняюцца, і шлагбаумаў, сваіх аўтобусаў, а таксама правілаў перавозкі ў іх дзяцей.

Найбольшае практычнае значэнне маюць схема арганізацыі дарожнага руху паблізу ўстановы адукацыі і схема маршрутаў бяспечнага перамяшчэння навучэнцаў «дом — установа адукацыі — дом». Буйнафарматныя схемы можна будзе знайсці на інфармацыйных стэндах. Як паведаміла **старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе аддзела ДАІ Кастрычніцкага РУУС Мінска Вікторыя ЦАРУК,** у Кастрычніцкім раёне сталіцы таксама прынята рашэнне схему маршрутаў бяспечнага руху размясціць у дзённіках, што дасць магчымасць вучням і іх бацькам падрабязна іх вывучыць, а ў выпадку неабходнасці і пераправерыць на месцы. На схеме вылучаныя ўчасткі, дзе неабходна быць асабліва ўважлівымі.

Пашпарт дарожнай бяспекі.

### Падрыхтоўка да бяспекі

Напярэдадні пачатку новага навучальнага года Дзяржаўтаінспекцыя па ўсёй краіне правяла абследаванне ўчасткаў дарог, якія прымыкаюць да ўстаноў адукацыі. Асаблівая ўвага была ўдзелена наяўнасці і стану дарожных знакаў, дарожнай разметкі, у тым ліку разметкі «Школа» і выявы на праезнай частцы дарожнага знака «Дзеці», арганізацыі пешаходнага доступу на тэрыторыю школ, які выключае магчымасць нечаканага выхаду дзяцей на праезную частку, наяўнасці агароджы тэрыторыі і шлагбаумаў, тратуараў і пешаходных дарожак паблізу ўстаноў адукацыі, вонкавага асвятлення па асноўных напрамках руху дзяцей-пешаходаў, а таксама ўладкаванню штучных няроўнасцяў.

Па выніках праведзеных абследаванняў выдадзена 738 прадпісанняў. У органы мясцовай улады накіравана 222 інфармацыйныя запіскі аб існуючых праблемных пытаннях. У асобных выпадках за наяўныя дэфекты і недахопы вулічна-дарожнай сеткі службовыя асобы дарожных і камунальных арганізацый прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці.

Не пакінуты без увагі і арганізацыі, якія ажыццяўляюць падвоз вучняў да навучальных устаноў. Праводзяцца праверка тэхнічнага стану школьных аўтобусаў, абследаванне маршрутаў і інструктажы кіроўцаў па мерах засцярогі і асаблівасцях перавозак груп дзяцей.

### Не забывайце ўключаць фары

Традыцыйна ў канцы лета праводзіцца комплекс мерапрыемстваў «Увага — дзеці!». Акцыя стартавала 25 жніўня, калі па ўсёй краіне прайшоў Адзіны дзень бяспекі дарожнага руху пад дэвізам «Бяспека дзяцей на дарозе — клопат дарослых!». Дарэчы, гэты слоган выбраны нездарма: у жніўні на дарогах трое дзяцей загінулі, 29 атрымалі калецтвы і ў 20 выпадках непаўналетнія пасажыры пацярпелі з-за таго, што бацькі перавозілі іх з парушэннямі.

Нагадваем, што па 5 верасня рух транспартных сродкаў у светлы час сутак павінен ажыццяўляцца з уключаным блізкім святлом фар: для прыцягнення ўвагі ўсіх удзельнікаў дарожнага руху, а перш за ўсё маленькіх пешаходаў да аўтамабіляў, якія набліжаюцца. У першыя дні заняткаў ва ўсіх установах агульнай сярэдняй адукацыі будзе арганізаваны Тыдзень бяспекі дарожнага руху. Супрацоўнікі органаў унутраных спраў прымуць удзел ва ўрачыстых лінейках, прысвечаных пачатку навучальнага года, правядуць з навучэнцамі класныя гадзіны. Запланаваны шэраг прафілактычных мерапрыемстваў для дзяцей і падлеткаў. Конкурсы, віктарыны, кінавідэалекторыі і спартыўна-навучальныя заняткі закліканы нагадаць дзецям аб неабходнасці выканання правілаў бяспечных паводзін на дарозе.

Згодна са статыстыкай ДАІ, за 7 месяцаў бягучага года ў ДТЗ атрымалі траўмы 139 дзяцей, 8 загінулі. У параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года колькасць здарэнняў знізілася на траціну

### Парады бацькам

- Загадзя **вызначыце найбольш бяспечны шлях** ад дома да школы. Некалькі разоў прайдзіце па ім з дзіцем. Нават калі школьніку маршрут ужо добра вядомы, не лішнім будзе абнавіць яго ў памяці пасля канікул з усімі ўказаннямі аб выкананні правілаў бяспекі.
- Першы час па магчымасці **суправаджайце дзіця** на шляху ў школу і з яе.
- Заахвочвайце да правільных паводзін на дарозе. Калі ў канкрэтнай дарожна-транспартнай сітуацыі дзіця павяло сябе правільна, абавязкова пахваліце яго. Гэта будзе добрым стымулам і ў далейшым выконваць правілы паводзін на дарозе.
- Заўсёды **выходзьце** з дому **своечасова.** Важна, каб дзіця дабіралася да школы без спешкі, спакойна праходзіла ўвесь шлях.
- **Прагаворвайце** з дзіцем розныя дарожныя **сітуацыі.** Напрыклад, якія магчымы нечаканасці і як на іх трэба рэагаваць.
- Прымацуйце на дзіцячую вопратку **святлоадбівальныя элементы.** Іх павінна быць дастаткова, каб дзіця было добра прыкметна іншым удзельнікам дарожнага руху з усіх бакоў.
- **Будзьце** для дзіцяці **прыкладам.** Вы павінны правільна і бяспечна паводзіць сябе на дарозе, не пераходзіць яе на чырвонае святло, нават калі кудысьці спазняецеся. У адваротным выпадку ваша дзіця вырашыць, што ў парушэнні правілаў няма нічога дрэннага.

■ Гонар

# «АЛМАЗ», ЯКІ ЦЭНІЦЦА ВА ЎСІМ СВЕЦЕ

## Беларускія снайперы сталі прызёрамі міжнародных конкурсаў

**Гэты жнівень стаў для супрацоўнікаў спецыяльнага падраздзялення па барацьбе з тэрарызмам «Алмаз» багатым на ўзнагароды. У пачатку месяца яны паказалі сваё майстэрства на спаборніцтвах у Лібаве (Чэхія), а на мінулых выхадных вярнуліся пасля паспяховага выступлення ў Санкт-Пецярбургу.**

Як растлумачыў начальнік снайперскага аддзела і кіраўнік каманды — імёны стралкоў у мэтах бяспекі афішаваць не прынята, — Міжнародны турнір паліцэйскіх і ваенных снайпераў у Лібаве з'яўляецца адным з самых прэстыжных штогадовых профільных чэмпіянатаў нароўні з Кубкам свету ў Венгрыі. Дарэчы, і ў Будапешце на майскіх спаборніцтвах наша каманда таксама добра сябе праявіла і ўвайшла ў дзясятку наймацнейшых. Яшчэ раз на два гады праводзяцца буйныя спаборніцтвы ў Расіі: восеньскія ў Краснадары і цяжкія зімовыя ў Маскве, іх чарга надыдзе ў 2018-м.

Што да Чэхіі, то тут чэмпіянат прайшоў ужо 19-ы раз. Удзел прынялі 58 камандаў з 14 краін, кожная каманда — гэта снайперская пара. Нашыя снайперы занялі прызавое трэцяе і ганаровае пятае месцы, у мінулым годзе да п'едэстала ім не хапіла аднаго кроку. Нароўні з беларусамі спаборнічалі выхадцы з Украіны (дарэчы, яны занялі адразу першае і другое месцы), Расіі, Эстоніі, Славакіі, Сербіі, Даніі, Германіі, ЗША і іншых краін.

Усяго спаборніцтвы доўжыліся тры дні і складаліся прыблізна з 30 этапаў. Страляць трэба было з розных становішчаў і з рознай адлегласці: ад 15 да 750 метраў. Акрамя агульнага заліку, было адно дадатковае практыкаванне, якое ацэньвалася і ўзнагароджвалася асобна: стральба з прадстаўленай толькі напярэдадні этапу зброі. У ім ужо другая снайперская пара з «Алмаза» заняла трэцяе месца.

Кіраўнік каманды адзначыў, што дамагацца такіх высокіх вынікаў дапамагаюць зацятая падрыхтоўка і вялікі спаборніцкі вопыт, у той час як многія іншыя краіны робяць стаўку, і не заўсёды правільна, выключна на абсталяванне. Дарэчы, у майстэрстве снайпера сталы ўзрост часта іграе на руку. Калі праграмай не прадугледжаны празмерныя фізічныя нагрузкі, то спецыялісты з вопытам, хутчэй за ўсё, змогуць адолець моладзь.

А вось Адкрыты чэмпіянат Расіі сярод вайскоўцаў сілавых структур па стральбе з баявой зброі адносіцца да тых, дзе ў трохбор'і трэба праявіць не толькі дакладнасць і сабранасць, але і цягавітасць. На адным з этапаў неабходна было на сабе несці параненага — макет важыць, як дарослы мужчына — і яшчэ страляць з розных становішчаў.

На спаборніцтвах у Чэхіі.

У гэтым годзе на спаборніцтвы запрасілі не толькі прадстаўнікоў падраздзяленняў, якія ўваходзяць у Расгвардыю, але і іншыя дзяржавы — Беларусь і Казахстан. Першапачаткова была зарэгістраваная 51 каманда, большасць з Паўночна-Заходняй акругі Расійскай Федэрацыі, аднак да начной стральбы дайшло ўсяго 30. Астатнія былі знятыя за парушэнне нормаў бяспекі: як толькі зроблены стрэл, зброю неабходна было ставіць на засцерагальнік.

Практыкаванні былі прадугледжаны рознабаковыя: вызваленне заложнікаў у аўтобусе і ў памяшканні, снайперская стральба, якая ўключае падгон экіпіроўкі, на дыстанцыі ў дзённы час ад 100 да 400 метраў, у начны — да 200. Дарэчы, стралялі як пры святле, так і ў поўнай цемры, выкарыстоўваючы толькі прыбор начнога бачання.

Падчас умоўнага абясшкоджвання тэрарыстаў у памяшканні наша каманда паказала найлепшы час. Неабходна было ацаніць пагрозу, выявіць, у каго ёсць зброя, правесці перагаворы, а таксама выканаць складаны элемент: адначасовы стрэл, які некалькі супрацоўнікаў робяць па кодавым слове.

Усе этапы супрацоўнікі сілавых структур праходзілі ў абмундзіраванні 5-га класа абароны, якое не здымалі на працягу ўсяго спаборніцкага дня: у форме, бронекамізэльцы і касцы — і ўсё гэта ў 30-градусную спякоту. У выніку беларуская каманда стала другой, саступіўшы толькі арганізатарам турніру, ветэранскаму клубу «Неўскі».

Інструктар каманды «Алмаз» заўважыў, што да прадстаўнікоў беларускага МУС неаднойчы падыходзілі расійскія калегі і адзначалі дакладнасць і зладжанасць іх дзеянняў. Праўда, некаторыя акцэнтавалі ўвагу і на тым, што каманда не прымала ўдзел у баявых дзеяннях, на што беларусы прывыклі адказваць адно: «І дзякуй богу!». Відэаматэрыялы са спаборніцтва потым выкарыстоўваюцца ў трэніроўках, а самі чэмпіянаты дапамагаюць выявіць моцныя і слабыя бакі падрыхтоўкі прафесіяналаў у мірных абставінах, каб не дапусціць памылак у выпадку небяспекі.

Апошнія ўзнагароды спецыяльнага падраздзялення па барацьбе з тэрарызмам «Алмаз».

Буйных снайперскіх турніраў у гэтым годзе ўжо не будзе. У другой палове кастрычніка пройдуць комплексныя спаборніцтвы сярод розных сілавых падраздзяленняў Рэспублікі Беларусь. А на працягу ўсяго года ідзе «Дынаміяда», нядаўна супрацоўнікі «Алмаза» спаборнічалі ў практычнай стральбе, у канцы жніўня будуць змагацца за перамогу ў шматбор'і

Матэрыялы падрыхтавала
Дар'я КАСКО. *kasko@zviazda.by*

## Извещение о проведении повторного аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | РУП «СМТ №22», Витебская обл., г. Полоцк, ул. Шенягина, д. 54. Тел.: + 375 (214) 41 72-95, тел./факс 41-80-30 |

**Лот №1**

Имущество, в составе объектов недвижимости, оборудования, а также запасы (сырье, материалы, инвентарь), реализуемое одним лотом, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Полоцк, ул. Шенягина, д. 54Б

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|---|
| **Бытовое здание** | Здание административно-хозяйственное | 55,5 кв. м | 250/С-36285 |
| **Бытовое здание кладовщика (в т.ч. терасса)** | Здание административно-хозяйственное | 14,3 кв. м | 250/С-36290 |
| **Гараж** | Здание специализированное автомобильного транспорта | 19,9 кв. м | 250/С-36287 |
| **Гараж №2** | | 21 кв. м | 250/С-36291 |
| **Профилакторий для автомашин, склад** | Здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей | 782,3 кв. м | 250/С-36286 |
| **Канализационная сеть** | Сооружение специализированное водохозяйственного назначения | - | 250/С-39742 |
| **Тепловая сеть** | Сооружение специализированное коммунального хозяйства | - | 250/С-39970 |
| **Склад с мастерскими** | Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | 693 кв. м | 250/С-36289 |

**Составные части принадлежности**: две пристройки, рампа, ограждение (кирпичное, сборные железобетонные плиты), ворота

С перечнем оборудования, прочих основных средств, материальных запасов (сырье, материалы, инвентарь) и временных сооружений, входящих в состав предмета аукциона, можно ознакомиться на сайте организатора аукциона www.cpo.by

| | |
|---|---|
| **Обременения** | Частичная аренда. Подробная информация на сайте организатора аукциона www.cpo.by |
| **Начальная цена с НДС 20%** | **88 342,78 белорусских рублей** |
| **Шаг аукциона** | **4 417,14 белорусских рублей** |
| **Сведения о земельном участке** | Для содержания и обслуживания зданий и сооружений производственной базы предоставлен участок на праве постоянного пользования общ. пл. 2,0897 га. Обременения: охр. зона систем газообеспечения и др. линейных инженерных сооружений, площадь 0,0390 га; охр. зона ЛЭП, напряжением свыше 1000 В, площадь 0,2460 га |
| **Порядок ознакомления** | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом аукциона осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Тукиш Валентина Евгеньевна, завхоз, контактный телефон МТС +37533-346-50-90 |

**Лот №2**

Имущество, в составе объектов недвижимости, оборудования, реализуемое одним лотом, в составе:

| Наименование | Назначение | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|---|
| **Склад баллонов** | здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | 55,1 кв. м | 250/С-34535 |

Составные части и принадлежности: покрытие бетонное, ограждение (панели железобетонные), ограждение из металлических прутьев обрамленное металлическим уголком), ворота.

**Адрес:** Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 23В, в 0,3 км к востоку от д. Ксты

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Канализационная насосная станция хозфекальная** | здание специализированное коммунального хозяйства | 48,8 кв. м | 250/С-34541 |

Составные части и принадлежности: надземная и подземная части.

Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 23В/1, в 0,3 км к востоку от д. Ксты

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Площадка к козловому крану** | сооружение специализированное транспорта | 2 336 кв. м | 250/С-39623 |

Составные части и принадлежности: бетонное покрытие, ограждение, ворота, подкрановые пути.

**Адрес:** Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, в 0,3 км к востоку от д. Ксты, площадка к козловому крану

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Внеплощадочная канализационная сеть хозфекальная** | сооружение специализированное коммунального хозяйства | 606 м | 250/С-39076 |

Составные части и принадлежности: участок сети (трубопровод напорный от КНС (хозфекальной) до К1 – 2 шт., колодец, трубопровод безнапорный от К1 до К)

**Адрес:** Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12 в 0,3 км к востоку от д. Ксты внеплощадочная канализационная сеть хозфекальная от КНС (хозфекальной) до колодца в г. Полоцке, р-н ул. Строительной, 30/6

**В состав лота входит следующее оборудование:**

электрическая кран-балка (2 тн), инв. номер 05129, кран козловой КК-1-20-25 (20 тн), инв. номер 02212, насос ФГГ-30/10, инв. номер 05153, насос погружной «Гном» 16х16

| | |
|---|---|
| **Сведения о земельном участке** | Для обслуживания здания склада баллонов с площадкой для хранения железобетонных изделий предоставлен участок на праве постоянного пользования общ. пл. 0,9090 га |

**Начальная цена с НДС 20% – 34 905,72 белорусских рублей BYN.**
**Шаг аукциона – 1 745,29 белорусских рублей BYN**

**Лот №3**

Имущество в составе объектов недвижимости, оборудования, материалов, реализуемое одним лотом, в составе:

| Наименование | Назначение | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|---|
| **Производственный корпус** | производственное помещение | 4234,2 кв. м | 250/D-36006 |

**Адрес:** Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 23-2, в 0,3 км к востоку от д. Ксты

| | | | |
|---|---|---|---|
| Обременения | договор аренды. Подробная информация на сайте www.cpo.by | | |
| **Канализационная насосная станция ливневая** | здание специализированное коммунального хозяйства | 223,1 кв. м | 250/С-34540 |

Составные части и принадлежности: подземная часть, бетонное покрытие (2833 кв. м); ограждение (панели железобетонные) длиной 193,2 м; ограждение (кирпичи) длиной 9,6 м; дороги и проезды заводской территории наружной площадью 159 кв. м (покрытие бетонное; плиты железобетонные); ворота (1/2 часть).

**Адрес:** Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 23Г, в 0,3 км к востоку от д. Ксты

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Внеплощадочная канализационная сеть ливневая** | сооружение специализированное коммунального хозяйства | 785 м | 250/С-39078 |

Составные части и принадлежности: участок сети (трубопровод напорный от КНС (ливневой) до К1, колодец К1, трубопровод безнапорный от К1 до К).

**Адрес:** Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12 в 0,3 км к востоку от д. Ксты, внеплощадочная канализационная сеть ливневая от КНС (ливневой) до колодца в г. Полоцке, р-н ул. Строительной, 30/6

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Сеть ливневой канализации** | сооружение специализированное коммунального хозяйства | 2160,5 | 250/С-36840 |

Составные части и принадлежности: сеть ливневой канализации, в т. ч. трубопровод безнапорный, 87 колодцев, 12 дождеприемников, 25 выпусков.

**Адрес:** Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, в 0,3 км к востоку от д. Ксты, сеть ливневой канализации

**В состав лота входит следующее оборудование:**

Насос ФГГ 50/12,5, инв. номер 05150, насос ФГГ 50/12,5, инв. номер 05151, насос ФГГ 50/12,5, инв. номер 05152, мост. кран16-5к-22.5-16-У3, инв. номер 02244, мост. кран16-5к-22.5-16-У3, инв. номер 02245, электротельфер канатный 0,5т, б/н, насос «Гном», б/н

С перечнем оборудования, материальных запасов (сырье, материалы, инвентарь), входящих в состав предмета аукциона, можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

| | |
|---|---|
| **Сведения о земельном участке** | Для обслуживания здания канализационной насосной станции предоставлен участок на праве постоянного пользования общ. пл. 0,6463 га |

**Начальная цена с НДС 20% – 409 986,27 белорусских рублей BYN**
**Шаг аукциона – 20 499,31 белорусских рублей BYN**

| | |
|---|---|
| **Порядок ознакомления по лотам №№2-3** | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом аукциона осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Абловацкий Петр Владимирович, ведущий механик, контактный телефон 8029-212-15-01 |

**Предмет аукциона**

**Транспорт, спецтехника и оборудование, расположенные по адресу:** Витебская область, Полоцкий район, Экиманский с/с, 0,3 км к востоку от д. Ксты, в составе:

| № лота | Инв. № | Наименование предмета аукциона, год выпуска | Начальная стоимость, бел. руб. с учетом НДС | Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|---|
| 4 | 01153 | Автомобиль ГАЗ 31105 2224ВА-2 | 1 037,60 | 51,88 |
| 5 | 01021 | Автомобиль ЗИЛ-441510 рег. знак 8989ВТР | 537,60 | 26,88 |
| 6 | 03327 | Бульдозер на базе трактора ДТ-75 ВА 3434 | 2 496,00 | 124,80 |
| 7 | 03454 | Дизмолот сваебойный МСДШ | 3 792,00 | 189,60 |
| 8 | 02500 | Захват 1ПТМ 791170 г/п 10т | 288,00 | 14,40 |
| 9 | 02501 | Захват 2ПТМ 791170 г/п 5т | 360,00 | 18,00 |
| 10 | 02218 | Кран башенный БМ-401П | 47 976,00 | 2 398,80 |
| 11 | 03534 | Установка копровая для заб. свай на базе Т-10МБ 21-21-0 ВА-2 67-46 | 35 760,00 | 1 788,00 |

**Порядок ознакомления:** ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Абловацкий Петр Владимирович, ведущий механик, контактный телефон +375292121501

**Предмет аукциона**

**Оборудование, расположенное по адресу:** Витебская область, Полоцкий район, Экиманский с/с, 0,3 км к востоку от д. Ксты, в составе:

| № лота | Инв. № | Наименование предмета аукциона, год изготовления | Начальная стоимость, бел. руб. с учетом НДС | Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|---|
| 12 | 31799 | Агрегат сварочный АДД 4002 М2 | 1 056,00 | 52,80 |
| 13 | 31800 | Агрегат сварочный АДД 4002 М2, 2006 г. в. | 1 056,00 | 52,80 |
| 14 | 31801 | Агрегат сварочный АДД 4003, 2000 г.в. | 912,00 | 45,60 |
| 15 | 05063 | Дистиллятор | 60,00 | 3,00 |
| 16 | 00086 | Измеритель дымности отработавших газов МЕТА-01 МП.01, 2009 г. | 118,60 | 5,93 |
| 17 | 04012 | Мобильная дизельная вакуумная установка для понижения уровня грунтовых вод Н 130Д, 2008 г. | 13 851,20 | 692,56 |
| 18 | 31798 | Сварочный аппарат JASIC ARC-140, 2007 г. в. | 9,60 | 0,48 |
| 19 | 05106 | Станок сверлильный СМ-8П,1993 г. | 128,20 | 6,41 |
| 20 | 05081 | Станок СУН-1 (механическая пила), 1992 г. | 335,00 | 16,75 |
| 21 | 05071 | Станок шлифовальный 3К-634, 1987 г. в. | 60,00 | 3,00 |
| 22 | 05040 | Стенд профилактики 240 | 880,80 | 44,04 |
| 23 | 05061 | Стенд Р-770, 1991 г. в. | 309,60 | 15,48 |
| 24 | 05053 | Тележка Э-312, 1991 г. в. | 38,40 | 1,92 |
| 25 | 31816 | Трансформатор ТДМ-403 У2 | 64,80 | 3,24 |
| 26 | 41227 | Автоматический станок для резки штапика СКУ-501 | 582,60 | 29,13 |
| 27 | 42020 | Выпрямитель V-160 S, 2006 г. в. | 68,00 | 3,40 |
| 28 | 42019 | Выпрямитель ВД-306 М1У3, 2006 г. в. | 122,20 | 6,11 |
| 29 | 42021 | Выпрямитель дуговой сварки ВДМ-1202С, 2007 г. | 273,00 | 13,65 |
| 30 | - | Емкость для транспортировки сыпучих материалов | 408,00 | 20,40 |
| 31 | - | Емкость для транспортировки сыпучих материалов | 408,00 | 20,40 |
| 32 | 47228 | Комплект тензометрии BSS-2t с индикатором Ci 6001 | 38,40 | 1,92 |
| 33 | б/н | Машина ИП-1000 | 1 680,00 | 84,00 |
| 34 | 47197 | Машина испытательная ИП-100, 1994 г. в. | 1 011,60 | 50,58 |
| 35 | 40221 | Парогазогенератор ПГГ-2 | 864,00 | 43,20 |
| 36 | 07394 | Подмости шарнирно-панельные ПШ-000А | 156,96 | 7,85 |
| 37 | 07395 | Подмости шарнирно-панельные ПШ-000А | 156,96 | 7,85 |
| 38 | 07396 | Подмости шарнирно-панельные ПШ-000А | 156,96 | 7,85 |
| 39 | 42022 | Полуавтомат дуговой сварки ПДГ-351, 2007 г. | 374,40 | 18,72 |
| 40 | 41229 | Пресс пробивочный однопозиционный ПР 235, 2010 г. | 150,40 | 7,52 |
| 41 | 41230 | Пресс пробивочный однопозиционный ПР 235, 2010 г. | 150,40 | 7,52 |
| 42 | 41231 | Пресс пробивочный однопозиционный ПР 235, 2010 г. | 150,40 | 7,52 |
| 43 | 41232 | Пресс пробивочный однопозиционный ПР 235, 2010 г. | 150,40 | 7,52 |
| 44 | 40015 | Сварочный аппарат ВДМ-1201,1991 г. | 184,80 | 9,24 |
| 45 | 41228 | Станок для зачистки углов профиля КТ-504/2, 2009 г. | 1 212,00 | 60,60 |
| 46 | 44169 | Станок для резки а/ц труб | 40,80 | 2,04 |
| 47 | 41036 | Станок заточной М-405 | 88,80 | 4,44 |
| 48 | 41044 | Станок настольно-сверлильный ВШ-029 | 696,00 | 34,80 |
| 49 | 41048 | Станок правильно отрезной СМЖ 357К | 792,00 | 39,60 |
| 50 | 44093 | Станок сверлильный СМ-8ПК | 86,40 | 4,32 |
| 51 | 41041 | Станок токарный 1К-62 | 336,00 | 16,80 |
| 52 | 42069 | Станок точечной сварки МТ16/18, 1991г. | 676,80 | 33,84 |
| 53 | 05070 | Станок фрезерный 6Р82 | 792,00 | 39,60 |
| 54 | 44095 | Станок шлифовальный 3К-1334 | 184,80 | 9,24 |
| 55 | 43079 | Сушильный шкаф СНОЛ 3.5, 1997 г.в. | 94,80 | 4,74 |
| 56 | 00464 | Трансформатор сварочный ТДМ-252 У2 | 74,40 | 3,72 |
| 57 | 40018 | Трансформатор ТСЗИ 380/36, 1993г. | 26,00 | 1,30 |
| 58 | 41065 | Установка горизонтальная СМЖ-54А | 1 608,00 | 80,40 |
| 59 | 40220 | Установка прогрева бетона КТП ОБ 63 У1 | 240,00 | 12,00 |
| 60 | 40024 | Установка прогрева бетона КТП ТО 80-86 У1, 1996 г. в. | 275,40 | 13,77 |
| 61 | 40025 | Установка прогрева бетона КТП ТО 80-86 У1, 1996 г. в. | 275,40 | 13,77 |
| 62 | 70223 | Шкаф металлический, 2000 г.в. | 53,60 | 2,68 |
| 63 | 8911 | Блок-контейнер | 729,20 | 36,46 |
| 64 | 8907 | Блок-контейнер «Душевые кабины женские» | 1 434,40 | 71,72 |
| 65 | 047 | Бороздодел GNF 65 A | 189,60 | 9,48 |
| 66 | 056 | Гидравлический домкрат | 105,60 | 5,28 |
| 67 | 057 | Гидравлический домкрат | 105,60 | 5,28 |
| 68 | 00520 | Нивелир линейный лазерный Bosh GLL2-50+BM1+LR2 | 110,40 | 5,52 |
| 69 | 30004 | Нивелир НИ-3, зав. № 2359 | 84,00 | 4,20 |
| 70 | 00517 | Нивелир С330 зав. № 554690 | 31,20 | 1,56 |
| 71 | 050 | Пресс гидравлический ПГР - 300 | 36,00 | 1,80 |
| 72 | 00513 | Тахеометр SET530RK3 | 1 101,60 | 55,08 |
| 73 | 00506 | Теодолит 3Т5КП | 302,40 | 15,12 |
| 74 | 04130 | Штукатурная станция СШ-6 | 1 128,00 | 56,40 |
| 75 | 04131 | Штукатурная станция СШ-6 | 984,00 | 49,20 |
| 76 | 00485 | Блок снижения напряжения БСН 1 СУ3, 2008 г. в. | 57,60 | 2,88 |
| 77 | 00486 | Блок снижения напряжения БСН 1 СУ3, 2008 г. в. | 57,60 | 2,88 |
| 78 | 01207 | Очиститель высокого давления Kranzle 800 TS T | 756,00 | 37,80 |
| 79 | 00481 | Ручной сварочный экструдер 2007 CS, 2011 г. в. | 982,20 | 49,11 |
| 80 | 05132 | Сварочная машина Ровелд Р250 А2, 2006 г. в. | 1 029,60 | 51,48 |
| 81 | 00924 | Сверлильная система ДС350 | 290,40 | 14,52 |
| 82 | 01138 | Станция прогрева бетона ТСД 3-80/0,38 У3 | 613,80 | 30,69 |
| 83 | 01139 | Станция прогрева бетона ТСД 3-80/0,38 У3 | 613,80 | 30,69 |
| 84 | 00490 | Трансформатор НТС 2.5У, 2011 г.в. | 31,20 | 1,56 |
| 85 | 00491 | Трансформатор НТС 2.5У, 2011 г.в. | 31,20 | 1,56 |
| 86 | 00463 | Трансформатор ТДМ-403У2, 2008 г.в. | 64,80 | 3,24 |
| 87 | 01129 | Установка для приготовления и выдачи раствора УПР-3 | 2 224,80 | 111,24 |
| 88 | 01130 | Установка для приготовления и выдачи раствора УПР-3 | 2 224,80 | 111,24 |
| 89 | 01117 | Установка для приготовления и выдачи раствора УПР-3, 2008 г. в. | 288,00 | 14,40 |

**С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона** WWW.CPO.BY

**Порядок ознакомления:** ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 13.00 до 14.00. **По лотам №№12–25** ответственное лицо: Абловацкий Петр Владимирович, ведущий механик, контактный телефон: +375292121501. **По лотам №№26–62** ответственное лицо: Зызников Виктор Иванович, заведующий базой, контактный телефон +375336774509. **По лотам №№63–75** ответственное лицо Тукиш Валентина Евгеньевна, завхоз, контактный телефон +3753333465090. **По лотам №№76–89** ответственное лицо Свердлов Михаил Данилович, ведущий энергетик, контактный телефон +375295163113

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона

**Срок оплаты: по лотам №№1–3**: не более 30 (тридцати) дней со дня заключения договора купли-продажи (если иное не предусмотрено договором купли-продажи).

**По лотам №№4–89**: при цене продажи предмета аукциона в сумме до 49 999,99 BYN – срок оплаты не более **10** (десяти) дней со дня заключения договора купли-продажи.

При цене продажи предмета аукциона в сумме свыше 50 000,00 BYN – срок оплаты не более **20** (двадцати) дней со дня заключения договора купли-продажи

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением СовМина РБ от 8 января 2013 г. №16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **WWW.CPO.BY**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5%

**Затраты** на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 10.08.2017 г.

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | 21.09.2017 в 13 час. 00 мин. по адресу: РУП «СМТ №22», Витебская обл., г. Полоцк, ул. Шенягина, д. 54, актовый зал |
| **Дата и время окончания приема документов** | **19.09.2017** до 17.00 по адресу: г. **Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. Email: auction@cpo.by** |

## Извещение о проведении открытых аукционов по продаже земельных участков в частную собственность

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 42-61-62

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка. Размер начальной цены и задатка |
|---|
| Лот №1. Земельный участок с кадастровым №220885614801000065, площадью 0,2498 га по адресу: Витебская обл., Браславский р-н, Межанский с/с, д. Струсто, участок №1 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения: водоохранные зоны рек и водоемов (озеро Струсто); охранные зоны особо охраняемых природных территорий (Национальный парк «Браславские озера»), придорожных полос (контролируемых зон) автомобильных дорог. **Нач. цена: 3 000 руб. Задаток: 300 руб.** |
| Лот №2. Земельный участок с кадастровым №220885614801000066 площадью 0,2499 га по адресу: Витебская обл., Браславский р-н, Межанский с/с, д. Струсто, участок №2 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения: водоохранные зоны рек и водоемов (озеро Струсто); охранные зоны особо охраняемых природных территорий (Национальный парк «Браславские озера»), придорожных полос (контролируемых зон) автомобильных дорог. **Нач. цена: 3 000 руб. Задаток: 300 руб.** |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 26.09.2017 в 12.00 по адресу: г. Браслав, ул. Советская, 119 в Браславском райисполкоме. Срок внесения задатков и приема документов: с 28.08.2017 с 8.30 по 25.09.2017 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» с 8.30 до 17.30 в рабочие дни. Реквизиты для внесения задатка: р/с BY42AKBB36003120500010000000 «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 3000594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Межанский сельсовет). Условия: в течение 2 месяцев со дня утверждения протокола аукциона обратиться за гос. регистрацией прав на зем. участок в Браславское бюро Полоцкого филиала РУП «Витебское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»; разработать и утвердить в установленном порядке проектно-сметную документацию на строительство объекта в срок, не превышающий 2 года; произвести занятие (освоение) зем. участка не позднее 1 года со дня утверждения проектной документации на строительство жилого дома; до начала строительства снять плодородный слой почвы в местах размещения строений и сооружений и использовать его в соответствии с проектной документацией |

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение зем. участка, размер начальной цены и задатка |
|---|
| Лот №1. Земельный участок с кадастровым №224485301601000043 площадью 0,2500 га по адресу: Витебская обл., Сенненский р-н, Ходцевский с/с, д. Берешево для строительства и обслуживания жилого дома. Ограничения: водоохранная зона водного объекта (озеро Сорро). **Начальная цена**: 1000 руб. **Размер задатка:** 100 руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY81AKBB36003260980040000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Ходцевский сельсовет) |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 27.09.2017 в 11.00 по адресу: г. Сенно, ул. К. Маркса, 2 в Сенненском райисполкоме. **Срок внесения задатков и приема документов:** с 28.08.2017 с 8.30 по 26.09.2017 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» с 8.30 до 17.30 в рабочие дни. Условия: обратиться в Сенненское бюро Оршанского филиала РУП «Витебское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в установленном порядке за гос. регистрацией права на зем. участок в двухмесячный срок со дня проведения аукциона; получить в установленном порядке техническую документацию и разрешение на строительство жилого дома; приступить к занятию зем.участка не позднее 1 года после получения свидетельства (удостоверения) о гос. регистрации права на него; осуществить строительство жилого дома в сроки, определенные проектно-сметной документацией |

Аукционы проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462. Для участия в аукционе приглашаются граждане РБ, консолидированные участники (двое и более граждан). Для участия в аукционе граждане РБ подают заявление об участии в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт гражданина РБ, представители граждан, уполномоченные лица (представители) – документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные в установленном законодательством порядке. **Условия аукциона:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся: внести плату за зем. участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением документации, необходимой для его проведения. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Назначение зем. участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: зем. участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по гос. регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем. участка.

**Конт. тел.: (0212)42-61-62, (029)510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by**

# ГРАДУС ТРЭБА ПАНІЖАЦЬ

## Самая вялікая на тэрыторыі СНД псіхіятрычная бальніца назапасіла ўнікальны вопыт аказання дапамогі залежным ад алкаголю

**Гэта клініка мае ўжо амаль 100-гадовую гісторыю. Шмат аддзяленняў аказваюць меддапамогу хворым з рознай псіхічнай паталогіяй, аднак толькі ў чатырох дапамагаюць пераадольваць залежнасці, у першую чаргу, алкагольную і наркатычную. У гэтых аддзяленнях сёння працуюць мультыдысцыплінарныя брыгады, у склад якіх уваходзяць урачы псіхіятры-нарколагі, псіхолагі і псіхатэрапеўты. Большая частка залежных пацыентаў Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра псіхічнага здароўя — з Мінска і Мінскай вобласці.**

Хтосьці прыязджае сюды па накіраванні псіхіятра-нарколага або псіхатэрапеўта (па месцы жыхарства), а хтосьці сам звяртаецца непасрэдна ў цэнтр, у кансультацыйна-паліклінічнае аддзяленне, спецыялісты якога і накіроўваюць на шпіталізацыю. Зварот можа быць цалкам ананімным, як і лячэнне, але ў такім выпадку яно будзе платнае. Вядома, не ўсе разумеюць неабходнасць своечасовага звароту да спецыялістаў. Калі залежны пацыент паступае менавіта ў вострым псіхатычным стане, галоўнае вызначыць, з чым звязаны такі стан пацыента, — ад гэтага будзе залежаць выбар тэрапеўтычнага ўмяшання. Дапамагае ў гэтым не толькі размова з пацыентам, але і псіхалагічнае тэсціраванне, лабараторныя даследаванні і г. д., тлумачыць **намеснік дырэктара па медыцынскай часці РНПЦ псіхічнага здароўя Аксана КАЛБАСАВА**.

У складаных сітуацыях для дыягностыкі ў цэнтры выкарыстоўваецца магнітна-рэзанансная тамаграфія, з дапамогай якой можна даследаваць галаўны мозг, яго сасуды і г. д. Акрамя таго, тут пры неабходнасці кансультуюць спецыялісты — тэрапеўт, неўролаг, эндакрынолаг, хірург, акуліст, дэрматавенеролаг, гінеколаг і іншыя. У складаных сітуацыях збіраецца кансіліум з некалькіх спецыялістаў.

Нярэдка ў пацыентаў з алкагольнай залежнасцю развіваецца абстынентны сіндром, або стан адмены. Выйсці з гэтага хваравітага стану дапамагае медыкаментозная тэрапія. Паказаны такім пацыентам і розныя фізіятэрапеўтычныя працэдуры, а таксама знакамітая баракамера — лячэнне кіслародам пад павышаным атмасферным ціскам. Працэдура добра вядомая ўжо шмат гадоў і карысная, дарэчы, не толькі для алкаголікаў. У народзе гэта яшчэ называюць ачышчэннем арганізма. Атмасферны ціск у баракамеры адчуваецца прыкладна так, як пры пагружэнні пад ваду на глыбіню 3—5 метраў. Галоўнае, не баяцца замкнутай прасторы. А так — ляжыш і проста дыхаеш кіслародам. Сакрэт жа ў тым, што чым мацней ціск газу, які мы ўдыхаем, тым лепш ён растваряецца ў вадкасцях, у гэтым выпадку ў крыві. Клеткі добра насычаюцца кіслародам, арганізм аднаўляецца. А заадно зніжаецца і жаданне выпіць, паляпшаецца сон, вяртаецца добры настрой, павышаецца працаздольнасць. Некаторым патрабуецца тры-пяць працэдур, некаму дзесяць. Называецца працэдура «гіпербарычная аксігенацыя».

Сучасныя падыходы да аказання меддапамогі пацыентам з залежнасцямі прадугледжваюць абавязковую рэабілітацыю. Цэнтр псіхічнага здароўя мае рэабілітацыйнае наркалагічнае аддзяленне —21-е, дзе атрымліваюць дапамогу мужчыны і жанчыны.

— У аддзяленні — 50 месцаў, большасць пацыентаў зараз — мужчыны. Частка хварэе не толькі на алкагалізм, але паралельна ўжывае яшчэ і наркотыкі, напрыклад, спайсы. Прыкладна палова знаходзіцца тут платна, і гэта, галоўным чынам, мінчане, — расказвае **загадчык 21-га наркалагічнага рэабілітацыйнага аддзялення РНПЦ псіхічнага здароўя Уладзімір ІВАНОЎ**. — Лячэнне комплекснае, уключае шырокі спектр медыкаментаў, бо нярэдка нашы пацыенты пакутуюць ад дэпрэсіі. Працуюць два ўрачы-псіхатэрапеўты і чатыры псіхолагі. У аснове работы — прынцыпы праграмы «Дванаццаць крокаў», а таксама пошук новых цікавых заняткаў, у першую чаргу, спорт, актыўнае грамадскае жыццё, дапамога такім жа... Што і не дзіўна: сярэдні ўзрост людзей з алкагольнай залежнасцю — 25—45 гадоў...

Ва ўсім свеце алкаголем злоўжывае прыкладна аднолькавая частка насельніцтва, сцвярджаюць спецыялісты. Аднак у нашай краіне ёсць свае асаблівасці і падставы для злоўжывання. У нашым выпадку неабходна імкнуцца да зніжэння ўзроўню спажывання алкаголю, а спосабы дасягнення гэтай мэты даўно і добра вядомыя. У першую чагу, праблема заключаецца ў высокай даступнасці — магазіны з алкаголем на кожным кроку. Месцы продажу неабходна скарачаць. Варта таксама збалансаваць кошт такіх напояў, а ўзрост продажу алкагольных напояў павысіць да 21 года. І адначасова трэба звярнуць увагу на агульную адукаванасць насельніцтва адносна таго, што такое алкаголь...

Калі зараз прыняць правільныя рашэнні, то за 20—25 гадоў Беларусь можа выйсці на ўзровень спажывання не больш за 6—7 л абсалютнага спірту на душу насельніцтва ў год (зараз у краіне гэта лічба складае 8,8 л). Пры гэтым спажываем мы ў першую чаргу моцныя напоі, а градус трэба паступова паніжаць, адзначае **галоўны нарколаг Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Іван КАНАРАЗАЎ**. Такім чынам, кошт акцызаў на моцны алкаголь будзе павышацца, а рэалізацыю алкаголю на тэрыторыі краіны плануецца забараніць з 23.00 да раніцы (за выключэннем аб'ектаў грамадскага харчавання), бо статыстыка сведчыць, што начная злачыннасць цесна звязана з «дагонкай», калі выпітага аказалася малавата.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*

# НЕДАБОР У... АРМІЮ

■ Плацдарм

## Каму — суды, каму — альтэрнатыва

Прызыўнікі пачалі скардзіцца ў суд. Раней да гэтай інстанцыі справа не даходзіла. Цяпер жа, калі юнак не згодны з высновамі прызыўной камісіі, ён звяртаецца ў суд. Напрыклад, гэтай вясной было пададзена 14 скаргаў, з іх 13 — ад жыхароў Гродна. Пасля разгляду справы суд у 12 выпадках пакінуў рашэнне прызыўных камісій у сіле. Гэта значыць, што прызыўнікі не маюць права «адкасіць» ад арміі. Зараз у судзе разглядаюцца яшчэ дзве падобныя справы.

Амаль паўтысячы прызыўнікоў зніклі з поля зроку ваенкаматаў. Як відаць, яны працуюць дзесьці за мяжой, і ўручыць ім павесткі немагчыма.

Некалькі пашырана кола прызыўнікоў, дзякуючы альтэрнатыўнай службе. Праўда, ахвотных не так многа, і колькасць іх у гэтым годзе зменшылася больш чым напалову. Калі ў мінулым прызыве было накіравана 16 чалавек, то сёлета толькі шэсць. Прычым некаторыя адмаўляліся ад альтэрнатывы ўжо ў працэсе службы і пераходзілі з працоўнай на ваенную. Тым не менш альтэрнатыўны варыянт дае магчымасць юнакам-пацыфістам выканаць свой воінскі абавязак, лічаць у ваенкамаце.

## Калі віртуальны танк замяняе баявы

Па словах **першага намесніка начальніка ўпраўлення аховы здароўя Гродзенскага аблвыканкама Наталлі АНТАНОВІЧ**, у сёлетнім прызыве спатрэбілася вельмі шмат дадатковых абследаванняў, у тым ліку спецыялістаў-псіхіятраў. А гэта падоўжыла працэс адпраўкі. Маладыя людзі з праблемамі псіхічнага і паводзінскага расстройства складаюць амаль 30% ад колькасці часова непрыдатных.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Загадчык аддзялення Гродзенскага абласнога клінічнага цэнтра «Псіхіятрыя-наркалогія» Ігар ЛЯЛЯЎКА** паведаміў, што за мінулы год было абследавана каля дзвюх тысяч прызыўнікоў, з якіх 70—80 % прызнаюцца здаровымі. Разам з тым за апошнія гады павялічылася колькасць асоб, якія могуць прызнацца часова непрыдатнымі толькі з-за таго, што не жадаюць служыць у арміі. Маўляў, не бачаць у гэтым сэнсу. Асабліва, калі ёсць сям'я, добрая праца...

— І гэты малады чалавек так і гаворыць: я не хачу служыць, я за сябе не адказваю, — расказвае Ігар Ляляўка, — і тады з ваенкамата такіх хлопцаў адпраўляюць да нас на камісію. Мы прымаем рашэнне правесці такіх пацыентаў праз стацыянар. У рэшце рэшт некаторым рэкамендуем адтэрміноўку.

Спецыялісты адзначаюць некалькі тыпаў расстройстваў паводзін. Значную групу складаюць узрушаныя асобы, калі чалавек хутка становіцца агрэсіўным, лёгка выходзіць з сябе, «успыхвае». Але зараз пачынае пераважаць група так званых замкнутых, інфантыльных, хатніх хлопчыкаў, якія не вылазяць з камп'ютараў.

Напрыклад, скончыў такі юнак факультэт інфарматыкі, сяброў не мае, сяброўка таксама, усё яго жыццё праходзіць у віртуальнай прасторы. Арміі такія юнакі баяцца, губляюцца, бо гэта іншы свет. Ігар Ляляўка расказаў пра маладога пацыента прызыўнога ўзросту, які стаў прызёрам вядомай гульні «вайна танкаў», але не мае жадання ўбачыць рэальны танк. Сіндром залежнасці ад усялякіх гаджэтаў становіцца важным фактарам непрыдатнасці да службы ў арміі.

Не возьмуць у армію і тых, хто хоць раз перанес псіхоз на фоне псіхатропных і наркатычных рэчываў.

## Дзе ўзяць рэсурс?

Цяпер у клінічным цэнтры абследуюцца тыя, каму прыйшла павестка на восеньскі прызыў. У кабінет ужо зайшоў хударлявы, невысокі хлопец. Паводзіць сябе вельмі сцішана. У псіхдыспансер накіраваны з той простай прычыны, што не жадае служыць. На пытанне, чаму не хоча выконваць свой грамадзянскі абавязак, адказвае прымітыўна: ужо позна (24 гады). Лічыць, што армія — гэта дарэмна страчаны час. Чаго ж ён дабіўся за гэты час? Цэлы арсенал «дасягненняў»: стаяў на ўліку ў міліцыі, быў адлічаны з каледжа, потым — умоўны тэрмін пакарання, не працуе. Сапраўды, ёсць што губляць... Цікаўлюся, які яму будзе прысуд?

— У першую чаргу афармім на стацыянарнае абследаванне, — кажа Ігар Ляляўка, — рызыка ў адпраўцы такіх, як ён, у армію, высокая. Як даць яму ў рукі зброю? Ён можа паводзіць сябе неадэкватна. Мы не можам браць на сябе адказнасць...

Падумалася: а чаму б такіх юнакоў не адпраўляць на альтэрнатыўную службу? Армію ніхто не адмяняў, а карысці ад гэтага можа і прыбавіцца. Зрэшты, у праблеме прыдатнасці да службы ёсць рэсурс, лічыць Аляксандр Вянсковіч. На яго думку, трэба «весці» прызыўніка ад прыпіскі да прызыву. Заўважана, што з гадамі хлопец толькі «губляе»здароўе. Таму ў першую чаргу будзе звернута ўвага на выяўленне хранічных захворванняў, якія ў значнай ступені прыводзяць да непрыдатнасці да службы ў арміі.

Што датычыцца чарговага прызыву, тут чакаецца новы падыход. У Міністэрстве абароны распрацавана спецыяльная праграма прафесійна-псіхалагічнага адбору, якая прадугледжвае наяўнасць псіхолага ў кожным раёне, паведаміў Аляксандр Вянсковіч. Раней гэта было неабавязкова. У чарговым прызыве не будуць прымаць удзел вайсковыя часці, як было раней. Усю работу па адборы і адпраўцы прызыўнікоў правядуць самі ваенкаматы.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
*margo@zviazda.by*

# На дарозе — «жалезныя» птушкі,

## або Як участак аўтатрасы становіцца запасным аэрадромам

**Быццам прыцэльваючыся, пілоты самалёта-штурмавіка Су-25 пралятаюць усяго за некалькі сантыметраў над дарогай. З другой спробы, упэўніўшыся ў бяспечнай пасадцы, з бліскучай дакладнасцю зліваюцца з магістраллю Мінск—Магілёў...**

Фота БЕЛТА.

Мінімум 250 кіламетраў у гадзіну хуткасці — і ніякіх прадстаўнікоў Дзяржаўтаінспекцыі. І гэта яшчэ не рэкорд! Учора на невялікі ўчастак рэспубліканскай аўтатрасы прызямліліся яшчэ і ваенна-транспартны самалёт Ан-26, вучэбна-баявыя Як-130, закладвала вушы ад знішчальнікаў МіГ-29.

Пасадка авіяцыйнай тэхнікі на аўтамабільны ўчастак дарогі ва Узброеных Сілах адпрацоўваецца не ўпершыню. Першы падобны вопыт беларускія авіятары правялі дзесяцігоддзе таму. З таго часу з году ў год лётчыкі ўдасканальваюць сваё майстэрства, прычым ужо і ў начных умовах.

Падчас крайняй пасадкі, якая праводзілася ў межах сумеснага спецыяльнага вучэння з сіламі і сродкамі тылавога, тэхнічнага (матэрыяльна-тэхнічнага) забеспячэння Узброеных Сіл Беларусі і Расіі, у прыватнасці падчас аператыўна-тактычнага вучэння з авіяцыяй, «жалезных» птушак на асфальт садзілі маладыя лётчыкі. Усе яны падобны іспыт на прафесіяналізм выконвалі ўпершыню.

— Усяго дзве трэніроўкі, а таксама добрае надвор'е, якое нам спрыяла, дазволілі з лёгкасцю ажыццявіць пасадку на аэрадромны ўчастак дарогі, — прызнаецца **намеснік камандзіра звяна вучэбна-баявых самалётаў Як-130 гвардыі капітан Андрэй БОДЗЮ,** які пасадзіў ваенны борт з першага разу. — Дарога, праўда, крыху вузейшая, чым узлётна-пасадачная паласа, але ніякіх цяжкасцяў не ўзнікла.

Што ні кажы, а лётчыкі — народ сціплы. Шырыня дарогі, на якую ажыццяўлялася пасадка, у два, а то і ў тры разы меншая, чым узлётна-пасадачнай паласы на звычайным аэрадроме. Акрамя таго, прызямляліся лётчыкі, лічы, на вока — адсутнасць радыётэхнічных сродкаў і сродкаў навігацыі, якімі абсталяваны аэрадром, безумоўна, ускладніла ім задачу.

— Тое, што пасадка на аэрадромны ўчастак дарогі гэтымі пілотамі ажыццяўлялася ўпершыню, сведчыць аб тым, што ў нас ідзе планавая падрыхтоўка ўсіх лётчыкаў да выканання падобных задач, — падкрэсліў **намеснік камандуючага Ваенна-паветранымі сіламі і войскамі проціпаветранай абароны Узброеных Сіл Беларусі — начальнік авіяцыі генерал-маёр Аляксандр КАРАЎ**. — Падзеі ў Сірыі паказалі, што аэрадром — гэта адзін з першых аб'ектаў удару ў выпадку ваеннага канфлікту. Гэтае вучэнне дазваляе нам выканаць разгрупаванне авіяцыі, а таксама баявыя задачы ў тым выпадку, калі праціўнік захоча вывесці аэрадром са строю.

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

■

Наш культурны асяродак
ЖЫРАНДОЛЯ
Выпуск №32 (379)



■ Кінакрокі

## Ігар ПОРШНЕЎ:

# «НЯМА ТАКОГА РЭЖЫСЁРА, ЯКІ НЕ ПРЭТЭНДУЕ НА ОСКАР»

**Калі яшчэ нядаўна з «Беларусьфільма» рэдка прыходзілі навіны пра здымкі ігравога кіно, то апошнім часам яны з'яўляюцца адна за другой — пра баявік, серыялы, фільм Дзмітрыя Астрахана і іншае. Таму, калі мы прыйшлі да дырэктара нацыянальнай кінастудыі Ігара ПОРШНЕВА на інтэрв'ю, перш за ўсё запыталіся аб прычынах такога «буму».**

— З моманту, калі ў верасні 2015 года я заняў пасаду дырэктара кінастудыі, да жніўня 2016-га не прайшло ніводнага конкурсу кінапраектаў Міністэрства культуры, а бюджэтныя сродкі мы можам атрымаць толькі праз яго. У гэты час мы завяршалі дзве ігравыя карціны, мультстудыя была больш-менш загружана, затое студыя дакументальнага кіно «Летапіс» аказалася на мяжы выжывання, мы тут нават рэкламу здымалі. Нарэшце, у конкурсе 2016 года мы перамаглі ў пэўнай колькасці намінацый і запусцілі праекты ў работу, таму цяпер у вытворчасці знаходзіцца адразу шэсць ігравых карцін. Мяне радуе, што кінастудыя загружана, праўда, лепш было б, каб працэс здымак быў рытмічным, бо нашы тэхнічныя магчымасці не бясконцыя, тым больш што «Беларусьфільм» знаходзіцца ў завяршальнай стадыі рэканструкцыі. Прыходзіцца перараз мяркоўваць кіназдымачнае, асвятляльнае і гукавое абсталяванне, дзяліць мантажныя кабінеты. Але ўсё адно групы працуюць з вялікім энтузіязмам, я думаю, у наступным годзе ў нашага маркетынгавага аддзела будзе шмат працы па рэалізацыі створанага.

**«Зараз мы тэрмінова выконваем даручэнне Міністэрства культуры і кіраўніка дзяржавы — здымаем восем кароткаметражных фільмаў пра лаўрэатаў Дзяржаўнай прэміі».**

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

***— Раскажыце пра ігравыя фільмы, якія знаходзяцца ў здымачным перыядзе.***

— Адзін з іх — працяг тэлесерыяла «Ой, ма-мач-кі», што з поспехам прайшоў на расійскіх каналах і нядаўна быў паказаны на нашым тэлебачанні. Восенню група павінна завяршыць здымкі, распачаць мантажна-таніровачны перыяд і ў гэтым жа годзе здаць серыял. Гэта камерцыйны праект, мы будзем рэалізоўваць яго на расійскім рынку і разлічваем зарабіць. Фільм Дзмітрыя Астрахана «Жыццё пасля жыцця» — першая за шмат гадоў паўнавартасная сумесная работа нашага Міністэрства культуры і Міністэрства культуры Расійскай Федэрацыі. Цікавая карціна з прыцягненнем расійскіх зорак і вялікай колькасцю нашых акцёраў. Цяпер актыўна ідуць здымкі, мы зробім чатырохсерыйную версію для тэлеэкрана і поўнаметражны фільм для кінаэкранаў Беларусі і Расіі. У такім жа двайным фармаце, дарэчы, выйдзе жорсткі баявік «Чорны сабака», здымкі якога мы скончылі паўтара месяца таму. Таксама запусціўся мастацкі кіраўнік «Беларусьфільма» Вячаслаў Нікіфараў з фільмам «Тум-пабі-дум» — вельмі цікавай работай «для сямейнага прагляду» пра хлопчыка з дзіцячага дома, здымалі ў сапраўдным дзіцячым доме. Мы з нецярпеннем чакаем карціну і разлічваем, што яна прыме ўдзел у кінафестывалі «Лістапад». Спадзяёмся, калі ўсе даручэнні кіраўніка дзяржавы будуць выкананы і ў лістападзе ён наведае «Беларусьфільм», каб «прыняць» завершаную рэканструкцыю кінастудыі, мы зможам паказаць «Тум-пабі-дум» першай асобе. Апроч іншага, «Беларусьфільм» запусціў прыгодніцкую карціну «Прынцэса і тыгр» Ігара Чацверыкова пра падлеткаў, якія шукаюць скарб у Нясвіжскім замку, і падрыхтаваў першы за доўгія гады зборнік дэбютных работ маладых рэжысёраў «Мы». Альманах складаецца з пяці кароткаметражак розных жанраў ад камедыі да драмы, яго мы таксама хочам аддаць на «Лістапад». Спадзяёмся, ён пройдзе і ў пракаце. Пры жаданні зборнік можна раскласці на асобныя фільмы, з якімі аўтары могуць удзельнічаць у кінафестывалях.

***— Здымкі альманаха «Мы», я так разумею, былі праведзены не за бюджэтныя грошы?***

— Сто працэнтаў бюджэтнага фінансавання. З дзесяці, нават больш, прэтэндэнтаў спецыяльная камісія выбрала пяць рэжысёраў. Можа, атрымаецца кожны год рабіць такія зборнікі, паглядзім, як ён пройдзе ў пракаце.

***— Калі вы здаяце фільм «Чорны сабака» і пра што гэты баявік?***

— Мы здадзім яго да канца года, карціна робіцца з прыцэлам на расійскія тэлеканалы, таму што яны больш плацежаздольныя, у фільме закранаецца і сірыйская праблема. «Чорны сабака» заснаваны на кнізе Мікалая Чаргінца, у яго ёсць моцныя дэтэктыўныя раманы. Не буду раскрываць гісторыю, скажу толькі, што тут добрыя артысты і здымачная група.

***— А не страшна брацца за такі складаны жанр?***

— Тут выдатны склад здымачнай групы і вельмі добрая літаратурная аснова. Калі ёсць добрая літаратурная аснова, не страшна, можна за ўсё брацца. Баявік — папулярны мужчынскі запатрабаваны жанр, у якім наш партнёр Глеб Шпрыгаў мае вялізны вопыт працы. Цяпер, калі ў нас ужо ёсць чарнавы мантаж, я бачу, што атрымліваецца дастаткова захапляльны фільм, высокай якасці матэрыял. Нашы магчымасці, піратэхнічныя і іншыя, — усё дастойна.

***— Гэта значыць, што ў «Беларусьфільма» добры вопыт стварэння баевікоў? Яны акупаюцца?***

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. №16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **www.cpo.by**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику, по начальной цене, увеличенной на 5%

**Затраты** на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **27.09.2017 в 13.00 по адресу: РУП «СМТ №22», Витебская обл., г. Полоцк, ул. Шенягина, д. 54, актовый зал** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **25.09.2017** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. Email: auction@cpo.by** |

■ Лёсы

# Афрыканская эпапея беларускіх верталётчыкаў

**У 1998 годзе «Звязда» была першым і адзіным рэспубліканскім выданнем, якое ўзяло праблему вызвалення беларускага экіпажа верталётчыкаў, што апынуліся ў якасці заложнікаў у заходнеафрыканскай краіне Сьера-Леонэ, пад пастаянны кантроль.**
**Экіпаж складалі чатыры чалавекі: Васіль Кулькоў з Пружан, Іван Мартыновіч са Слоніма, Уладзімір Чэпель (пра яго на працягу доўгага часу так нічога і не атрымалася даведацца: адкуль ён, дзе жыве) і камандзір-расіянін з Яраслаўля Аляксандр Сапожнікаў. (Яго жонка Таццяна была мінчанкай — яны мелі кватэру ў сталіцы і былі прапісаны ў ёй. На той момант часова пражывала разам з дочкамі ў Яраслаўлі.)**

Звесткі пра верталётчыкаў даходзілі да «Звязды» праз шматлікія інстанцыі, насілі адрывачны характар, часам прыходзілі са скажэннем ці наогул факты выключалі адзін аднаго. Мы адсочвалі гэтую гісторыю з сярэдзіны мая па 7 жніўня, калі журналіст газеты сустрэў на сталічным вакзале двух членаў экіпажа — Васіля Кулькова і Івана Мартыновіча, якія ўвечары выйшлі на перон з трынаццатага вагона маскоўскага цягніка. Да гэтага яны патэлефанавалі жонкам з Гвінеі: іх вызвалілі! У фірменнай «звяздоўскай» майцы ўвечары таго ж дня Іван Мартыновіч даваў інтэрв'ю тагачаснаму каналу ГРТ.

Пілоты трапілі на работу ў афрыканскую краіну яшчэ ў 1995 годзе. Вядома, каб зарабіць, палепшыць дабрабыт сем'яў. Хто ж ведаў, што паездка ў выніку абернецца шматмесячным палонам і згубай усяго зароблена... Верталётчыкі вазілі прэзідэнта Сьера-Леонэ або розныя грузы. Па некалькі разоў прыязджалі дадому ў водпуск. Путч адбыўся 25 мая 1997 года, яго здзейснілі малодшыя армейскія афіцэры. Неўзабаве заложнікаў перавезлі ў Нігерыю...

Вось што мне расказаў на пероне сталічнага вакзала пра тыя дні Іван Мартыновіч, пакуль Васіля Кулькова адцягнулі некуды ўбок сустракаючыя.

***— Іван Міхайлавіч, а дзе ваш трэці таварыш — Уладзімір Чэпель?***

— Чэпель паехаў на поўнач Беларусі. У яго становішча горшае, чым у нас, — ён скасаваў шлюб. У яго ўвогуле ўсё было горш. Калі нас проста ўкралі і завезлі ў Нігерыю, дык ён з самага пачатку трапіў у турму, дзе мы потым знаходзіліся...

***— Што вам там давялося перажыць?***

— У тых месцах, дзе мы былі, не любяць белых. Мала таго, што нас білі за тое, што мы белыя, дык нас білі яшчэ і за тое, што мы рускія. Мы гаварылі, што рускія, бо пра Беларусь яны ўсё роўна нічога не ведаюць.

***— Я размаўляў з вашым камандзірам, Сапожнікавым, ён ужо дома, перадаваў вам прывітанне. Дык ён сказаў, што вас не білі, не катавалі...***

— Нас не білі пастаянна, нас білі перыядычна. Білі не за тое, што мы нешта зрабілі, а таму, што так прынята ў гэтай краіне — біць чалавека, разумееце? На мне яшчэ засталіся сляды ад наручнікаў (паказвае рукі з цёмнымі палоскамі). Гэта калі нас абяцалі вярнуць дамоў з Нігерыі апошні раз, а замест гэтага адправілі ў турму Фрытаўна — сталіцы Сьера-Леонэ. Гэта ўжо белыя пастараліся, юараўцы, што працуюць там...

***— Ці праўда, што вы былі параненыя ў руку?***

— Так, асколак трапіў мне ў руку (паказвае зноў цёмную адмеціну на правай руцэ). Мы працавалі на перавозцы грузаў, параненых — так прыйшлося...

***— Вы прымалі ўдзел у баявых дзеяннях? Вас прымушалі да гэтага?***

— Разумееце, я не магу сказаць, што наша праца была цалкам грамадзянскай. Мы пражылі чатырох прэзідэнтаў. Цяжка пра гэта гаварыць...

***— Колькі вы ўвогуле прабылі ў Афрыцы?***

— Тры гады і адзін месяц. Я вельмі шмат бачыў... Нас проста ўкралі з суверэннай краіны (гаворка ідзе пра Лібер'ю, дзе прызямліўся верталёт з беларускім экіпажам) і мы пяць з паловай месяцаў жылі ў Нігерыі. У мяне Нігерыя забрала здароўя больш, чым хто-небудзь іншы. Там я кожны дзень чакаў смерці. Калі мы туды прыбылі, нас адразу папярэдзілі, што спосабаў пакінуць жыццё існуе мноства. Цябе могуць расчляніць, скінуць з верталёта і гэтак далей.

***— Што там для вас было самым цяжкім?***

— ...Я марыў там, што калі вярнуся і прыеду дамоў, пацалую сваю зямлю. Самае складанае пытанне, якое стаяла там перада мной, — пытанне выжывання. Нас трымалі ў няведанні ў адной з самых вялікіх краін Афрыкі. Няведанне давяло мяне да такога стану, што на нервовай глебе ў мяне адмовілі ногі, левае вока стала дрэнна бачыць і г. д. З намі жылі смертнікі — людзі, якіх потым забівалі. Таму на працягу пяці з паловай месяцаў асабіста я, не ведаю, як мае таварышы, можа, ім было лягчэй, а я быў у горшым стане, дык я кожны дзень чакаў самага горшага. Таму я вельмі рады, што вярнуўся на радзіму. Гавораць, што Бога няма, але там я паверыў, што Бог ёсць...

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

Навукоўцам-разумнікам дзячу я —
Вынаходзяць яны з году ў год.
Тэлеграф, тэлефон, тэлебачанне...
Кажуць, вынайдуць тэлепорт.
Дазваніцца ў вёску любую
Можаш з Арктыкі ці з Гвінеі.
— Прывітанне! Ты чуеш? — Чую!
— Як там маці? Як сад квітнее?
Твой званок мяне ў пушчы знойдзе,
На арбіце мяне дагоніць...
Акадэмік «на сувязь выходзіць»,
Першакурснікі «тэлефоняць».
Дзіцяняткі мабільнікі маюць,
Але што ж гэта будзе далей?
Людзі ноччу і днём размаўляюць,
А дамовіцца ўсё цяжэй!
Ўсё цяжэй уявіць пачутае
І пачутае зразумець.
Чалавецтва глухое пакутуе —
Дайце рады яму ацалець!
Хай прадоўжыцца век электронны,
Але я загадаю жаданне:
Каб пачуліся без тэлефонаў
І ўсё зразумелі зямляне.

**РУП «Институт недвижимости и оценки» (организатор торгов) извещает о проведении повторного открытого аукциона со снижением цены по продаже административного здания с инв. №500/С-46538, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Платонова, д. 31а, принадлежащего унитарному предприятию «Поречье Белкоопсоюза» (Продавец).**

Земельный участок площадью 0,0311 га с кадастровым номером 500000000008001584 предоставлен на праве аренды по 28.02.2022. Целевое назначение: Земельный участок для эксплуатации и обслуживания административного здания. Описание права, ограничения (обременения) прав: - охранная зона водопровода, площадь 0,0163 га; - охранная зона телефонной канализации, площадь 0,0062 га. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

**Начальная цена с НДС – 80 556,00 бел. руб. Задаток 8 055,60 бел. руб. Шаг аукциона – 5%.**

Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, 220004, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже здания (Лот № 1), принадлежащего УП «Поречье Белкоопсоюза», проводимом 28 сентября 2017 г.

Договор купли-продажи Объекта должен быть заключен в течение 10 (десяти) календарных дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан оплатить стоимость приобретенного на аукционе Объекта в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня заключения договора купли-продажи. Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 5% (пяти процентов) от цены продажи Объекта в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

Аукцион состоится 28.09.2017 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 26.09.2017 до 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 18.05.2017. С полным текстом извещения можно ознакомиться на сайте Организатора аукциона ino.by.

Продавец: Унитарное предприятие «Поречье Белкоопсоюза», 220035, г. Минск, ул. Татарская, 3-316, т. (017) 203 82 93

**Организатор аукциона: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7 ☎ +375 17 306-00-57 • +375 29 550-09-52 • + 375 29 356-90-03 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

# ПРАРВАЦЦА НА ПІРЭНЕІ

## Чаму Іспанія прыцягвае ўсё больш мігрантаў?

**Іспанская аўтаномія Каталонія стала новай крывавай мішэнню для тэрарыстаў. Напады адбыліся на барселонскім пешаходным бульвары Рамбла і ў прыморскім Камбрыльсе, загінулі і паранены дзясяткі людзей. Як стала вядома, тэракты планавалася ажыццявіць і ў шэрагу іншых турыстычных месцаў. Сярод іх — порт Барселоны і нават сусветна вядомы сабор Саграда Фамілія, які спраектаваў і пачаў узводзіць геніяльны архітэктар Антоніа Гаўдзі. Тэракты ў Барселоне і Камбрыльсе сталі вынікам правальнай міграцыйнай палітыкі Еўрасаюза. З такой заявай выступіў міністр знешнеэканамічных сувязяў і замежных спраў Венгрыі Петэр Сіярта. У адпаведным кантэксце выказаўся і міністр унутраных спраў Польшчы Марыюш Блашчак. Насамрэч трывожныя сігналы прагучалі яшчэ да крывавых падзей — міграцыйныя патокі сёлета змясціліся ў бок Пірэнеяў. Чаму Іспанія апошнім часам прыцягвае ўсё больш мігрантаў?**

### Праз Гібралтарскі праліў

Паводле даных Міжнароднай арганізацыі па міграцыі, сёлета за сем месяцаў звыш 9700 бежанцаў па моры дасягнулі іспанскіх берагоў, што ўтрая (!) больш, чым за ўвесь мінулы год. Тысячы мігрантаў заехалі ў краіну па сушы, перш за ўсё праз іспанскія анклавы Сеўта і Мелілья на паўночным узбярэжжы Марока. Як толькі бежанцаў размяшчаюць у часовых сховішчах, яны атрымліваюць доступ да Іспаніі, адкуль многія пераязджаюць у іншыя краіны Еўропы. Усяго ў гэтым годзе ў Іспанію дабралася каля 12 тысяч мігрантаў у параўнанні з 13 246 за ўвесь 2016-ты. Дарэчы, у Грэцыю сёлета прыбылі 14 156 чалавек.

Пакуль у бясспрэчных лідарах Італія: гэтая краіна прыняла ўжо 97 тыс. мігрантаў у гэтым годзе ў параўнанні з 181 436 летась. Апеніны сталі асноўным пунктам прызначэння для бежанцаў, пасля таго як Турцыя адмовілася ад пагаднення з ЕС, падпісанага летась у сакавіку. Усяго за апошнія чатыры гады сюды прыбылі амаль 600 тысяч чалавек. Між тым, як заўважаюць эксперты, Рыму ўдалося стабілізаваць сітуацыю з бежанцамі. Меры італьянскага ўрада прыносяць плён. Дзявяты вал мігрантаў, пра які казалі ў Італіі з вясны, падобна, рэзка пайшоў на спад. У маі гэтая краіна падпісала пагадненне з Лівіяй, Чадам і Нігерам з мэтай спыніць паток бежанцаў па Міжземным моры з дапамогай паляпшэння пагранічнага кантролю. У ліпені Італія таксама заключыла пагадненне з Францыяй і Германіяй аб узмацненні жорсткасці рэгулявання руху суднаў, якія падбіраюць мігрантаў у Міжземным моры, і павелічэнні аб'ёму сродкаў для лівійскай берагавой аховы. З таго моманту адпаведная служба гэтай афрыканскай краіны не дазваляе тысячам мігрантаў перабрацца на Пірэнеі.

Калі ў Італію ў ліпені прыехала амаль удвая менш мігрантаў, чым у чэрвені (усяго 10 160 тыс. чалавек, што з'яўляецца мінімумам з чэрвеня 2014-га), то ў Іспанію прыток бежанцаў вырас значна. У ліпені, па даных еўрапейскага пагранічнага агенцтва Frontex, на Пірэнейскі паўвостраў прыбылі амаль 2300 мігрантаў. Гэта ў 4 разы больш, чым у ліпені мінулага года. Імкліва набірае папулярнасць так званы заходні маршрут — праз 12-кіламетровы Гібралтарскі праліў. Часы, калі мігранты маглі лёгка трапіць у Еўропу, падобна, застаюцца ў мінулым. Спачатку пры дапамозе пагаднення паміж Турцыяй і ЕС, падпісанага ў сакавіку 2016 года, фактычна быў перакрыты ўсходні маршрут праз Турцыю, Грэцыю і Балканы. З іншага боку, рэзка ўзмоцнены меры бяспекі на шляху з Лівіі ў Італію, які цяпер з'яўляецца асноўным шлюзам для тых, хто хоча трапіць на тэрыторыю еўрапейскіх краін. Не дзіўна, што бежанцы (а ахвотных пашукаць лепшага жыцця ў Еўропе ў Афрыцы і Азіі менш не становіцца) кінуліся на захад Чорнага кантынента і спрабуюць пераправіцца з Марока ў Іспанію. Усім памятныя кадры, на якіх адпачывальнікі на папулярным пляжы ў Кадысе здзіўлена глядзяць, як да берага прыстае невялікае судначка, перагружанае цемнаскурымі людзьмі. Здаралася, што толькі за адзін дзень берагавая ахова Іспаніі выратоўвала да 600 чалавек, якія спрабавалі пераправіцца з Афрыкі праз Гібралтарскі праліў.

### Небяспечны трэнд

Не варта забываць і пра бяспеку. Прычым не толькі бежанцаў, якіх у гэтым годзе ў Гібралтарскім праліве патанула не менш за 120 чалавек, але і саміх іспанцаў. Улады Іспаніі паведамілі пра тое, што афрыканскія мігранты спрабуюць перасекчы мяжу ў Сеўце, дзе ўжо ўсталяваны платы вышынёй да 6 метраў з калючым дротам. Міністр унутраных спраў Іспаніі Хуан Ігнасіа Заіда паведаміў, што сёлета за сем месяцаў тут было здзейснена 2266 спробаў пераадолець перыметр у параўнанні з 3472 спробамі летась. Пры гэтым гаворка ідзе пра тое, што сотні мігрантаў з дзідамі, дубінамі і іншай самаробнай зброяй аб'ядноўваюцца ў групы і атакуюць закрытую мяжу. Спробы прарываў адбываюцца амаль штодня.

Большасць мігрантаў перапраўляецца праз Гібралтарскі праліў нават на лодках без маторaў і гідрацыклах. Гэта дапамагае ім пазбегнуць бандаў кантрабандыстаў, якія бяруць вялікія грошы. Гэтым маршрутам карыстаюцца выхадцы з Заходняй Афрыкі. Асабліва шмат грамадзян Сенегала, Гамбіі, Гвінеі, Нігерыі і Котд'Івуара. Ёсць, вядома, і бежанцы з Азіі. Сярод азіятаў пераважаюць грамадзяне Бангладэша. У адрозненне ад сірыйцаў, іракцаў і афганцаў, якія карысталіся «ўсходнім» маршрутам праз Турцыю і Грэцыю, гэта ў пераважнай масе эканамічныя, а не палітычныя мігранты.

Да канца года, па прагнозах Міжнароднай арганізацыі па міграцыі (IOM), Іспанія па колькасці бежанцаў, якія перапраўляліся морам, можа абысці Грэцыю. «Маршрут паміж узбярэжжамі Марока і Іспаніі лічыцца найбольш бяспечным — з гэтым мы звязваем рост колькасці мігрантаў у дадзеным кірунку. Цалкам магчыма, сёлета Іспанія перагоніць Грэцыю па колькасці бежанцаў. Калі гэты трэнд працягнецца з той жа хуткасцю, з якой развіваецца цяпер, гэта можа стаць вялікай надзвычайнай сітуацыяй», — заўважыў афіцыйны прадстаўнік IOM Джоэл Мілман. Не дзіўна, што самая аўтарытэтная ў каралеўстве газета El Pais б'е трывогу: «Відавочна, што міграцкія патокі перамяшчаюцца ў заходняе Міжземнамор'е, і няма ніякіх падстаў спадзявацца, што сітуацыя зменіцца ў найбліжэйшай будучыні».

Відавочна, што Іспанія насамрэч апынулася на мяжы сур'ёзнага гуманітарнага крызісу. Нездарма агенцтва ААН абвясціла папярэджанне іспанскім уладам, перадае The Guardian. На думку экспертаў гэтай арганізацыі, міграцыйная служба Іспаніі не мае належных магчымасцяў для абароны насельніцтва ад колькасці бежанцаў, якія штодня нелегальна перасякаюць марскую мяжу з боку Марока. Прадстаўнік Упраўлення вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў у Іспаніі Марыя Хесус Вега заявіла, што мясцовая паліцыя мае дрэннае забеспячэнне. На тэрыторыі краіны адсутнічаюць неабходныя перакладчыкі, адзначаецца недахоп жылля для мігрантаў. «Дзяржава не падрыхтавана, няма нават сродкаў для барацьбы з нелегальным патокам людзей, якія прыбываюць праз мора, — заўважыла Вега. — Улічваючы цяперашні рост колькасці мігрантаў, мы назіраем няўдалыя спробы мясцовых уладаў, якія спрабуюць урэгуляваць работу асноўных пунктаў прыбыцця. Мы папрасілі іх аб стварэнні правільных механізмаў бяспекі, каб да людзей ставіліся з годнасцю, калі яны прыязджаюць». Як сцвярджаюць прадстаўнікі дабрачыннай арганізацыі «Урачы без межаў», прыёмныя цэнтры Іспаніі ўжо перагружаны і не ў стане дапамагчы тысячам новапрыбылых людзей.

Краіна не зможа самастойна справіцца з гэтай праблемай, для кіравання міграцыйнымі патокамі спатрэбяцца адзіная еўрапейская палітыка і дастатковыя эканамічныя рэсурсы. Але самыя вялікія міграцыйныя рухі яшчэ наперадзе. Паводле прагнозаў, насельніцтва Афрыкі падвоіцца ў наступныя дзесяцігоддзі. Гэта азначае, што насельніцтва Егіпта дасягне 100 млн чалавек, Нігерыі — 400 млн чалавек. І мала хто захоча жыць у гэтых краінах, калі ёсць магчымасць атрымаць шанц на «лепшае жыццё» ў Старым Свеце. Шэраг экспертаў падкрэсліваюць, што цяпер мы назіраем адну з самых масавых міграцый у гісторыі і яна будзе ўзмацняцца. Прэзідэнт Еўрапейскага парламента Антоніа Таяні заўважыў, што для таго, каб спыніць паток мігрантаў з Афрыкі, Еўрасаюзу неабходна будзе інвеставаць мільярды еўра і распрацаваць доўгатэрміновую стратэгію сталізацыі кантынента: «Калі нам не ўдасца вырашыць цэнтральныя праблемы ў афрыканскіх краінах, 10, 20 ці нават 30 мільёнаў мігрантаў прыбудуць у Еўрапейскі саюз на працягу наступных дзесяці гадоў».

### «Рэбус» без вырашэння?

З мігрантамі з Марока ў Іспанію напэўна спрабуюць перапраўляюцца ісламскія радыкалы. Гэтая праблема пасля тэрактаў у Каталоніі надзвычай актуальная. Як заўважыў дырэктар расійскага Цэнтра вывучэння Блізкага Усходу і Цэнтральнай Азіі Сямён Багдасараў, для ісламістаў еўрапейскія краіны — абсалютна чужая цывілізацыя, якая ўяўляе для іх аб'ект для нападу. Дарэчы, на думку экспертаў, Каталонія — іспанская аўтаномія з самым высокім узроўнем актыўнасці радыкальных ісламістаў. Захады ўсіх сіл бяспекі, якія дзейнічаюць на гэтай тэрыторыі, дасюль дазвалялі папярэдзіць трагедыі. Так, паліцэйскі, які працаваў пад прыкрыццём у метро Барселоны, дапамог прадухіліць тэрарыстычную атаку. Падчас далейшага расследавання высветлілася, што ісламісты рыхтаваліся атакаваць станцыю метро Liceu. З 2012 года ў Каталоніі сіламі Грамадзянскай гвардыі, Нацыянальнай паліцыі і каталонскага падраздзялення Mossos d'Esquadra было праведзена 30 антытэрарыстычных аперацый, падчас якіх было затрымана 62 падазраваныя.

Бягучыя даныя паліцыі за 2017 год сведчаць, што Каталонія працягвае ўзначальваць спіс аўтаномій з максімальным узроўнем актыўнасці ісламістаў: сёлета да апошніх крывавых падзей было праведзена 7 антытэрарыстычных аперацый і затрымана 11 падазраваных. Далей па спісе ідзе Мадрыд: 7 аперацый і 10 арыштаў. Каталонія прыняла найбольшую колькасць мусульман, якія прыбылі ў краіну падчас хвалі іміграцыі да 2007 года. Большая частка з іх мараканцы. Тым не менш выхадцаў з іншых краін, асабліва Паўночнай Афрыкі, значна пабольшала, а арабская ператварылася ў адну з найбольш распаўсюджаных замежных моў у Каталоніі. Такую канцэнтрацыю мусульманскага насельніцтва неадкладна вырашылі выкарыстаць у сваіх мэтах радыкальныя інтэрнацыяналісты, каб весці прапаганду супраць заходняга ладу жыцця і дэмакратычных каштоўнасцяў. Месцы для правядзення малітваў сталі тэрыторыяй, дзе прадстаўнікі груповак рэалізоўвалі свае палітычныя інтарэсы, вышукваючы людзей, адчувальных да ідэй радыкальнага ісламу. Па падліках спецыялістаў, у Каталоніі існуе каля 50 цэнтраў, дзе прапаведуюць салафізм. Гэта палова ад агульнай колькасці такіх устаноў, арганізаваных у Іспаніі. У Барселоне і яе наваколлі ў свой час былі ліквідаваныя ячэйкі, якія займаліся вербаваннем салдат для адпраўкі ў гарачыя кропкі (Афганістан, Ірак). Акрамя таго, спецслужбам даводзіцца старанна адсочваць дзейнасць падобнага роду ў «сусветным павуцінні», якое ператварылася ў адзін з асноўных сродкаў ажыццяўлення інтарэсаў ісламістаў.

Абмяркоўваючы павелічэнне міграцыйнага патоку і рост тэрарызму ў ЕС у апошнія тры гады, даследчыкі часта згадваюць і такі ўскосны эфект, як магчымае ўзмацненне жорсткасці памежнага кантролю ў Шэнгенскай зоне. Наступствы гэтай меры могуць быць дастаткова сур'ёзнымі. Пасля тэрактаў у лістападзе 2015 года ў Парыжы, калі загінулі 130 чалавек, у ЕС зрабілі больш жорсткім кантроль на межах паміж дзяржавамі саюза. Паколькі тры чвэрці еўрапейскага тавараабароту залежыць ад аўтаперавозак, такія меры непазбежна адбіваюцца на аб'ёмах таргоў. Пасля ўзмацнення жорсткасці памежнага кантролю было апублікавана некалькі даследаванняў, у якіх эканамісты паспрабавалі ацаніць страты ў выпадку калапсу Шэнгенскай зоны. Даследчая група CESifo лічыць, што поўная адмена спрошчанага надгляду на межах у ЕС знізіць гадавы аб'ём тавараабароту на 220 млрд еўра (у параўнанні з гіпатэтычнай сітуацыяй, калі кантролю на межах няма наогул). У даследаванні ўрада Францыі адзначаецца, што вяртанне кантролю на межах прывядзе да спаду гадавога ВУП Еўрасаюза на 100 млрд еўра (0,8%). Нямецкі інстытут Bertelsmann Stiftung ацаніў страты ад патэнцыйнага калапсу Шэнгенскай зоны ў 470 мільярдаў еўра за 10 гадоў. Так што пытанне наконт узмацнення памежнага кантролю (ці нават закрыцця межаў), напэўна, з разраду рытарычных. І міграцыйны «рэбус» для той жа Іспаніі, якая апынулася на пярэднім краі гэтай насамрэч сусветнай праблемы, застанецца без вырашэння. На жаль, напружанасць на Пірэнеях застанецца на няпэўны час.

**Захар БУРАК.**
*burak@zviazda.by*

**РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о повторном открытом аукционе по продаже имущества должника, комплекса зданий насосной станции Сигма 1, Минская обл., Червенский район, Смолевичский с/с, аг. Заполье**

**Лот №1**. Капитальное строение с инв. №615/С-34600. Насосная станция Сигма 1. Составные части – пристройка; назначение – здание специализированное сельскохозяйственного назначения; г.п. – 1979; этажность – 1; общая площадь – 214,5 кв. м; фундамент – кирпичный; стены наружные и внутренние – кирпичные; перекрытия – ж/б; крыша – шиферная; полы – бетонные; проемы – деревянные; внутренняя отделка – оштукатурено, окрашено; инженерное оборудование – нет; вентиляция – естественная.

**Начальная цена продажи – 39 606,66 бел. руб. Задаток – 3 960,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5%**

**Лот №2**. Капитальное строение с инв. №615/С-34599. Склад насосной станции. Назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; г. п. – 1989; этажность – 1; общая площадь – 338,5 кв. м; фундамент – кирпичный; стены наружные и внутренние – кирпичные, блочные; перегородки – кирпичные; перекрытия – ж/б; крыша – совмещенная с рулонным покрытием; полы – нет; проемы дверные – металлические; инженерное оборудование – нет; вентиляция – естественная.

**Начальная цена продажи – 32 390,24 бел. руб. Задаток – 3 230,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5%**

**Лот №3**. Капитальное строение с инв. №615/С-34598. Контора насосной станции. Составные части – сарай; назначение – здание административно-хозяйственное; г. п. – 1981; этажность – 1; общая площадь – 56,4 кв. м; фундамент – кирпичный; стены наружные и внутренние – кирпичные; перегородки – кирпичные; перекрытия – ж/б; крыша – шифер; полы – бетонные, плитка; проемы оконные – деревянные, ст. блоки; проемы дверные – деревянные; наружная отделка – оштукатурено; внутренняя отделка – оштукатурено, облиц. плиткой; инженерное оборудование – нет. Вентиляция – естественная.

**Начальная цена продажи – 6 172,92 бел. руб. Задаток – 610,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5%**

СВЕДЕНИЯ О ЗЕМЕЛЬНОМ УЧАСТКЕ

Лоты №1, №2 и №3 расположены на земельном участке с кадастровым номером 625883500001001184. Адрес: Минская обл., Червенский район, Смолевичский с/с, аг. Заполье. Пл. 0,7427 га. Назначение – земельный участок для обслуживания конторы, склада, насосной станции «Сигма – 1». На праве постоянного пользования.

Ограничения (обременения) прав на земельный участок: водоохранная зона реки Волма, пл. 0,7427 га; прибрежная полоса реки Волма, пл. 0,0300 га; зона санитарной охраны водных объектов, используемых для питьевого водоснабжения (первый пояс водозабора «Водопой»), пл. 0,7427 га; охранная зона линий электропередачи напряжением свыше 1000 вольт, пл. 0,2400 га. На земельном участке находятся иные объекты, не выставляемые на аукцион. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

УСЛОВИЯ

1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объекты по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) (Претендент на покупку), обязан оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе имущества не позднее 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола аукциона.
2. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
3. Переход права собственности на приобретенные на аукционе Объекты недвижимости, имущество должника, осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 21.09.2017 г. в 14.00 по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.

Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X.

Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества (Лот №___), проводимом 21.09.2017 (Борисовский МРО).

Организация и проведение аукциона, а также оформление и регистрация сделки осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в г. Минске, ул. Комсомольская, 11, каб. 7 в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00. Окончание приема заявлений – 19.09.2017 в 11.00.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами аукциона. Контактное лицо для осмотра Объектов: 8-(029)-360-14-91, 8-(029)-695-33-84

**Контакты организатора аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 550 09 52, 8 (029) 550 09 59, 8 (029) 356-90-03 • www.ino.by • torgi@ino.by**

■ Хто каго?

# «ПАСЛЯ ЧАРКІ НЕЯК ДЗІМУ

## Захацелася экстрыму...»

**Што было — было, прычым так даўно, што гэтую гісторыю можна расказаць яшчэ раз. На Віцебшчыне ў адной сямейцы двое хлапцоў-падшыванцаў расло. Бацька ім матацыкл справіў за добрую вучобу, але не новы, відаць, бо хлопцы на ім не толькі па ваколіцах гойсалі, але і рамантавалі...**

У той дзень разабралі рухавік, прамылі ўсе дэталі ў бензіне, сабралі назад і паехалі б катацца, але ж трэба было недзе бензін той дзець... Нічога лепшага не прыдумалі: занеслі яго ў прыбіральню, вылілі і пакацілі... У гэты час дадому бацька вярнуўся і перш чым пайсці ў хату, збочыў у маленькі домік за лазню — прысеў там, закурыў, кінуў запалку за спіну...

Выбух яшчэ той быў! Курца аж на дрэва закінула!.. Ззаду ўзнялося полымя... Добра, што ратавальнікі паблізу былі — умомант прымчаліся! Лазню патушылі, пацярпелага завезлі ў бальніцу. І ўжо там усе хворыя пайшлі яму спачуваць: маўляў, ты такое месца сабе падсмаліў, бедны... «Ды не, людцы добрыя, — пярэчыў ім дзядзька, — яне бедны, мне нават пашчасціла, можна сказаць! А бедным я быў бы, калі б... кручок на дзверы накінуў. Тады б галаву прыйшлося лячыць, а тое месца нідзе не дзенецца — хутка зажыве».

Так яно ці не так, могуць адказаць прафесійныя лекары. Усе ж астатнія — у прыватнасці, удзельнікі конкурсу на лепшы подпіс да здымка *(гл. фота ўверсе)* — хіба паразважаць: «А якой такой «выбуховай» хваляй на дрэва (на паказальніку напісана «Биотуалет») загнала хлапца? Што ён там робіць?

Адказы на гэтыя пытанні — самыя розныя. **Спадар Іван Сіманёнак з Пастаў**, у прыватнасці, піша:

*Ці хацеў таго, ці не —*
*Настае хвілінка,*
*Што і цар не абміне*
*Пэўнае кабінкі.*
*А калі туды чарга?*
*Верхалаз мясцовы —*
*Чалавек-павук, Тарзан*
*Пойдзе па галовах!*

Альбо па дрэвах, як слушна заўважае **спадар Кісель з Мінска**:

*Сёмы ўказальнік*
*Хлопец сустракае!*
*Ён маленькі домік*
*З раніцы шукае,*
*А яго й з узвышша*
*Ўбачыць тут не выйшла!*

Гора!

Пра яго ж — і **спадарыні Соф'я Кусянкова з Рагачоўшчыны** ды **Любоў Чыгрынава з Мінска:**

*Свята ішло, —*
*Каб лепш — не трэба!*
*Ды узнікла тут патрэба...*
*Самы б час яе спраўляць,*
*Ды сарціра — не відаць.*
*Заклапочаны дзяцюк*
*Па вяроўцы ўзлез на сук,*
*Адшукаў арыенцір:*
*«Шыльда» — ёсць.*
*А дзе ж сарцір?*

Разам з героем здымка пытаецца пра гэта першая з жанчын. Не разумее і другая:

*Камунгасаўскі начальнік*
*Прычапіў быў указальнік*
*І як быццам кагадзе...*
*Прыбіральня толькі дзе?*

Трэба разумець, як у анекдоце: «Саша, паабяцай, што ажэнішся з Машай». — «Паабяцаць — магу, але жаніцца — не...» Вось і камунальнікам трэба было дзейнасць сваю паказаць, а потым...

Праблема, карацей, з гэтымі прыбіральнямі: яна даўно і ўсім аскому нагнала. Таму — «пункцірам» — некалькі прыкладаў. Выпуск навін: «Сёння нашы касманаўты, — расказвае дыктар, — ужо тройчы выходзілі ў адкрыты космас. І зноў з-за паломкі ўнітаза!». Дыялог у парку: «Скажыце, а дзе тут прыбіральня?» — «Азірніцеся! А дзе тут *не* прыбіральня?» Мужчына ў краме цыгарэты купіў, ад касы не адышоў, а ўжо смаліць... Прадавачкі яму: «Ды майце ж сумленне: тут не кураць!» Ён у адказ: «А чаму?.. Я ж у вас цыгарэты купляў...» — «Ну, у такім разе мы туалетную паперу вам не прададзім». Пра яе — аб'ява ў прыбіральні: «Калі ласка, карыстайцеся ёршыкам!» Унізе прыпіска: «А можна паперай? Бо ёршыкам дужа балюча».

І гэта было б смешна, як той казаў, калі б не было сумна.

А зрэшты, мы адхіліліся ад абранага курсу — варта вярнуцца назад, да пакінутага на дрэве хлопца, бо там, паводле **спадара Віктара Сабалеўскага з Узды**,

*Турбазу сёння шум запоўніў:*
*Атрад шугае за атрадам.*
*Вось толькі...*
*Дзе б знайсці «шпакоўню»?*
*Казалі, ёсць —*
*за даляглядам...*

І адшукаць яе, трэба разумець, — з «праважатым», пра якога піша **спадарыня Валянціна Гудачкова з Жыткавічаў:**

*Узабраўся Ясь высока...*
*Ды каб меў яшчэ і бінокль,*
*Мо б убачыў, небарака,*
*Той дамок, дзе можна...*

Ну, вы здагадаліся, бо сітуацыя, як ні круці, жыццёвая:

*Фота выклаў нам Кляшчук,*
*І не на пацеху:*
*Шмат хто быў*
*як той хлапчук...*
*Шчыра: не да смеху, —*

прызнаецца **спадар Валерый Гаўрыш з Чавусаў**.

Ён жа, дарэчы, прыгадвае, як аднойчы на вакзале мужчына ў прыбіральню ляцеў. «Дарогу, таварышы», — прасіўся здалёк. Патузаў ручку адной кабінкі — занятая; «Таварышы!» — патузаў ручку другой. Да трэцяй — з нецярпеннем: «Тава... Не... Не таварышы...»

І гэта ж — некалі даўно: тады яшчэ бясплатныя прыбіральні былі, не тое што цяпер, — заўважае **спадар Валерый**.

З таго ж канверта дыялог: «Я свой бізнес пачынаў з нуля», — хваліцца адзін з новых беларусаў. — «А я — з двух...» — «Гэта як?» — «Адкрыў платны туалет». І сапраўды — дзверы ў абсалютнай большасці вакзальных «дамкоў» цяпер пад «аховай» грозных цётачак: не заплаціш — не праскочыш. Адкуль:

*Па кішэнях рынак б'е —*
*Прыбіральні платныя.*
*Калі грошай не стае,*
*Учынкі адэкватныя?*

Ды ні ў якім разе, як лічыць **спадарыня Раіса Васільева з Гомеля!**

*Туалет, як бачна, — злева...*
*Ясь — вісіць чамусьці справа?*
*Хто яго загнаў на дрэва,*
*Калі ўнізе робяць «справу»?*

Для іх, вось гэтых спраў, асабліва падчас вялікіх свят (мае рацыю **спадар Гаўрыш**!), біятуалеты — разумнае выйсце:

*Ну вось, прагрэс ужо і ў нас:*
*З'явіўся біяунітаз.*
*Як ёсць патрэба — дуй туды...*
*Ды толькі выйшла як заўжды:*
*Знайсці з ім прыбіральню —*
*Занятак экстрэмальны!*

Мяркуючы па здымку, і сапраўды. Але ж асобныя чытачы (і тая ж **спадарыня Раіса Васільева**) бачаць не толькі тое, што ў кадры, але і тое, што за ім:

*Янак раз пашуткаваў:*
*«Пад хмары»*
*«шыльду» ўмацаваў...*
*Не знайшоўшы туалета,*
*Гараваў і той, і гэты...*
*І ў адказ пажартавалі,*
*На дрэва Яначку загналі:*
*Пакутаў іншым*
*хай не зычыць,*
*Хай сам павые,*
*як прыспічыць.*

...А зрэшты, што мы ўвесь час пра зямное, пра самае празаічнае? Час адарвацца ад яго, сігануць угору! Ну хоць бы з той жа **спадарыняй Чыгрынавай**, якая малюе цэлую карціну — не алеем, дык словам:

*Пасля чаркі неяк Дзіму*
*Захацелася экстрыму.*
*На сасну — як бач, залез!*
*І, напэўна б, неяк злез,*
*Але знізу і цішком*
*Трасе жонка кулаком:*
*«Порткі вымажаш смалой —*
*Дык умыешся крывёй!»*

Палохае, вядома ж! Хоць пры сённяшніх цэнах і портак шкада. А між тым іх можна захаваць чыстымі (і ад смалы таксама), калі, паводле **сужэнцаў Астроўскіх з Мінска,** да любога «ўзыходжання» рыхтавацца загадзя:

*Не іначай — думаў Федзя*
*Ісці ў пушчу на мядзведзя...*
*Касалапых не відаць? —*
*Трэніруецца ўцякаць.*

Прычым — не толькі ад звяр'я, на думку **спадарыні Гудачковай**,

*Год даймала хлопца дума:*
*Дзе б падзецца мне ад тлуму,*
*Ад натоўпу, мітусні?*
*Мо на дрэве абжывуся?..*
*Прыбіральня? Абыдуся!*
*Абы толькі ў цішыні!*

Для гараджан прага яе цалкам зразумелая:

*Хочам быць бліжэй да неба,*
*Марым мы аб вышыні.*
*Ды штодзённыя патрэбы*
*Нас трымаюць на зямлі.*

Грэх не згадзіцца са **спадаром Мікалаем Старых з Гомеля**! Як і з **мінчанамі Астроўскімі**:

*Дваццаць першы век шалёны:*
*Не злічыць атракцыёнаў —*
*Для дарослых, для дзяцей...*
*Рызыкуйма!*
*Усё часцей:*
*Лезем к небу і у воды...*
*А вылазім... не заўсёды.*

Таму перш чым «лезці», калі ласка, давайце падумаем. І папросім аб гэтым блізкіх: Бог, як вы помніце, сцеражэ сцеражонага.

...Што да папярэдняга здымка — на ім, нагадаем, былі два сімпатычныя дзядзькі на мосціку, абвешаным замкамі (гл. «Звязда» ад 15 чэрвеня), — то, паводле вялікага чытацкага журы, найлепшыя радкі пра іх напісалі **спадарыні Валянціна Гудачкова з Жыткавічаў, Соф'я Кусянкова з Рагачоўшчыны, Сафія Міцкевіч з Валожыншчыны і Войцік з Бабруйска, спадары Віктар Сабалеўскі з Узды, Мікола Кісель і сужэнцы Астроўскія з Мінска, Анатоль Кашэвіч з Лепельшчыны...**

«Ды што там — малайцы ўсе!» — прыйшло да высновы маленькае рэдакцыйнае журы і самым удалым прызнала подпіс **спадарыні Войцік** (*«Вешай ты хоць сто замкоў, — Зводзяць дзеўкі мужыкоў!»*). А таму прыз у выглядзе падпіскі на дарагую сэрцам «Звязду» накіроўваецца ў Бабруйск.

Хочаце, каб газета прыходзіла і да вас? Не пытанне, як той казаў: выпісвайце — на паўгоддзе, на квартал, на месяц (зрабіць гэта ніколі не позна), альбо ўважліва глядзіце на новы конкурсны здымак, прыдумвайце свае подпісы (можна некалькі, але не больш чым па восем радкоў) і дасылайце ў рэдакцыю. Шанц на перамогу ёсць у кожнага.

**Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*

**Замест пасляслоўя.**

*Тэма прыбіральняў і праўда нагнала аскому. Але...*

*Да знаёмца неяк госця прыязджала — са Швецыі. Даўгавата была: разам хадзілі па тэатрах, музеях, ездзілі на экскурсіі па нашых гарадах, вёсках і нават вёсачках...*

*Адна з высноў, якую перад ад'ездам зрабіла шведка: «Вашы мужчыны зусім не любяць вашых жанчын» (У тых ад нечаканасці мову заняло!..), бо калі б любілі, — прадоўжыла госця, — то ніколі б не змусілі хадзіць па патрэбе туды, куды яны ходзяць».*

*Адкуль просьба да мужчын: калі ласачка, успомніце маленькія дамкі, у якія ходзяць вашы маці, жонка, дачушкі, паважаныя супрацоўніцы... Там нічога нельга змяніць — да лепшага? Дзякуй.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Управляющий в производстве по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) ОАО «Агрокомбинат «Олехновичи» проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества:**

**Лот №1 – Имущество в составе:**

| Недвижимое имущество | | | |
|---|---|---|---|
| № | Наименование | инв. № | общ. пл., кв. м |
| 1 | здание конторы (административное здание) | 630/С-60033 | 1557,7 |
| 2 | здание проходной №1 | 630/С-73099 | 56 |
| 3 | здание склада №3 | 630/С-73101 | 16,7 |
| 4 | здание дезбарьера | 630/С-73106 | 51,6 |
| 5 | здание весовой | 630/С-73100 | 133,2 |
| 6 | здание спец автомобильного транспорта | 630/С-64351 | 736,6 |
| 7 | здание диспетчерской | 630/С-73110 | 22,7 |
| 8 | здание склада | 630/С-73105 | 71,8 |
| 9 | здание проходной №2 | 630/С-73140 | 6,3 |
| 10 | здание склада | 630/С-73103 | 1136,9 |
| 11 | здание склада | 630/С-73102 | 22,3 |
| 12 | мастерские механические | 630/С-64360 | 788,1 |
| 13 | здание колбасного цеха | 630/С-60036 | 902,1 |
| 14 | консервный цех | 630/С-64361 | 257,1 |
| 15 | здание котельной | 630/С-60028 | 890,7 |
| 16 | убойный цех | 630/С-64347 | 2137,9 |
| 17 | здание лаборатории | 630/С-73223 | 286,2 |
| 18 | здание скотобойной площадки | 630/С-73224 | 283 |
| 19 | здание склада для хранения тары | 630/С-73227 | 579 |
| 20 | здание склада | 630/С-73228 | 65 |
| 21 | здание склада | 630/С-73230 | 65,6 |
| 22 | здание склада | 630/С-73231 | 65 |
| 23 | здание склада | 630/С-73435 | 63,9 |
| 24 | здание склада | 630/С-73232 | 64,4 |
| 25 | здание склада | 630/С-73233 | 64,7 |
| 26 | здание ветблока | 630/С-73225 | 503,7 |
| 27 | склад для хранения комбикорма | 630/С-64346 | 865,3 |
| 28 | здание инкубационного цеха | 630/С-73107 | 1002,3 |
| 29 | здание специализированное животноводства | 630/С-64359 | 1363,4 |
| 30 | здание маточника птичника №2 | 630/С-73408 | 1364 |
| 31 | здание маточника птичника №5 | 630/С-73410 | 1386,4 |
| 32 | здание маточника птичника №4 | 630/С-73409 | 906,3 |
| 33 | здание маточника птичника №6 | 630/С-73411 | 1359,8 |
| 34 | здание маточника птичника №7 | 630/С-73412 | 1375,9 |
| 35 | здание птичника №17(2) | 630/С-42687 | 1093 |
| 36 | здание птичника №8 | 630/С-47495 | 1372,4 |
| 37 | здание птичника №24 | 630/С-60035 | 1440,2 |
| 38 | здание птичника №23 | 630/С-73407 | 1390,6 |
| 39 | здание птичника №22 | 630/С-73406 | 1382,1 |
| 40 | здание птичника №21 | 630/С-73405 | 1387,2 |
| 41 | здание птичника №20 | 630/С-73404 | 1392,1 |
| 42 | здание птичника №19 | 630/С-73403 | 1391,4 |
| 43 | здание птичник №18 | 630/С-73401 | 1390,8 |
| 44 | здание батарейного цеха №1 | 630/С-47499 | 1802,8 |
| 45 | здание батарейного цеха №2 | 630/С-47492 | 1804,4 |
| 46 | здание батарейного цеха №3 | 630/С-47502 | 1793,3 |
| 47 | здание птичника №17(1) | 630/С-42686 | 1096,7 |
| 48 | здание птичника №16 | 630/С-42685 | 1099,9 |
| 49 | здание птичника №15 | 630/С-42683 | 1097,2 |
| 50 | здание птичника №14 | 630/С-73400 | 1383,7 |
| 51 | птичник №13 | 630/С-64355 | 1385,2 |
| 52 | птичник №12 | 630/С-60032 | 1391,7 |
| **Недвижимое имущество** | | | |
| № | наименование | инв. № | общ. пл, кв. м. |
| 53 | птичник №11 | 630/С-64350 | 1378,5 |
| 54 | здание птичника №10 | 630/С-60031 | 1431,8 |
| 55 | птичник №9 | 630/С-64349 | 1421,1 |
| 56 | здание батарейного цеха №4 | 630/С-64356 | 1799,4 |
| 57 | батарейный цех №5/1,2 | 630/С-64352 | 1816,2 |
| 58 | здание батарейного цеха №6/1,2 | 630/С-64354 | 1816,2 |
| 59 | здание конюшни | 630/С-73413 | 294,7 |
| **Сооружения** | | | |
| | наименование | инв. № | протяженность/ общ. пл. |
| 60 | линия освещения | 630/С-73970 | 1778,9 м |
| 61 | сети электрические | 630/С-73972 | 6946,5 м |
| 62 | сети водоснабжения | 630/С-73973 | 5041,8 м |
| 63 | автомобильные дороги внутреннего и наружного использования | 630/С-73975 | 59453,7 кв. м |
| 64 | ливневая канализация | 630/С-74625 | 3249,8 м |
| 65 | сети газоснабжения и газораспределения | 630/с-77315 | 7783,4 м |
| Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 623800000001000019, общей площадью 88,9042 га (предоставлен на праве постоянного пользования) по адресу: Минская область, Молодечненский район, Олехновичский с/с, 43. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав: земли, находящиеся в охранных зонах магистральных трубопроводов, систем газоснабжения, код-7, площадь – 0,24 га; земли находящиеся в прибрежных полосах водных объектов, код-1, площадь – 6,93 га; земли, находящиеся в охранных зонах линий электропередачи, код – 6, площадь – 4,98 га | | | |
| 66 | пометохранилище | 630/С-73924 | 4466,0 кв. м |
| Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 623800000001000018, общей площадью 58,6567 га (предоставлен на праве постоянного пользования) по адресу: Минская область, Молодечненский район. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав: земли, находящиеся в охранных зонах линий электропередачи, код-6, площадь – 0,58 га; земли, находящиеся в охранных зонах линий электропередачи, код-6, площадь – 0,68 га | | | |
| 67 | оборудование согласно перечню (перечень находится у организатора аукциона) | | |
| 68 | малоценные быстро снашивающиеся предметы согласно перечню (перечень находится у организатора аукциона) | | |

Вышеуказанное имущество предназначено для производства мяса птицы и ведения товарного сельского хозяйства.

***Начальная цена с учетом НДС (20%) – 2 391 633 рубля 84 копейки.***

**Задаток в размере 5 (пять) % от начальной цены (119 581 рублей 69 копеек), перечисляется на р/с BY07MTBK30120001093300066778 в ЗАО «МТБанк», г. Молодечно, MTBKBY22 УНП 600077897 ОАО «Агрокомбинат «Олехновичи».**

***Сумма шага аукциона (5 %) – 119 581 рубль 69 копеек.***

**Дополнительные условия (лоту №1)**

1. Оплата за недвижимое имущество производится в рассрочку в течение 66 месяцев с момента подписания договора в соответствии с графиком платежей, который согласовывается сторонами при подписании договора.

До конца текущего года подлежит оплате не менее 15% от общей стоимости всего недвижимого имущества, далее оплата должна производиться ежемесячно в размере не менее 1% от общей стоимости всего недвижимого имущества.

2. Оплата за оборудование и иное имущество производится в рассрочку в течение 4 месяцев с момента подписания договора равными ежемесячными платежами.

**ТРАНСПОРТ**

| | Наименование/ рег. № | Кузов №, (VIN) | Год выпуска | Тип транспортного средства | Стоимость с НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона (5%), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| лот №2 | Audi A6 2332 BA-5 | WAUZZZ4AZSN027277 | 1994 | Легковой специальный седан | **1100,36** | **55,01** | 55,01 |
| лот №3 | GAZ-3309 AE 0778-5 | 33070070140601 33090070948602 | 2007 | Грузовой фургон | **714,4** | **35,72** | 35,72 |
| лот №4 | GAZ-3309 AB 3016-5 | 60040625 33090070921925 | 2006 | Грузовой фургон изотермический | **647,47** | **32,37** | 32,37 |
| лот №5 | ZIL-131 AI 2339-5 | 430945 | 1981 | Грузовой фургон (авторазливочная станция АРС) | **1 415,07** | **70,75** | 70,75 |
| лот №6 | ZIL-130 OM 1392 | 3149143 | 1981 | Грузовой специальный бункер | **1 858,94** | **92,94** | 92,94 |
| лот №7 | МАЗ 555147 1844 AK-5 | Y3M55514790000031 | 2010 | Грузовой самосвал | **2 024,76** | **101,23** | 101,23 |
| лот №8 | PAZ 3205 AE 6449-5 | XTM32050096002461 96002461 | 1996 | Автобус вагон | **728,92** | **36,44** | 36,44 |
| лот №9 | МАЗ 857100 4022 A 8383A-5 | Y3M857100A0006704 | 2010 | Прицеп специальный самосвал | **3843,65** | **192,18** | 192,18 |
| лот №10 | ПСТ-12 OB-5 8054 | 462 | 2010 | Полуприцеп | **4794** | **239,7** | 239,7 |
| лот №11 | ЗСКП-8 | - | 2000 | Загрузчик сухих кормов прицепной | **5932,15** | **296,6** | 296,6 |
| лот №12 | ПТУ 4-1 | - | - | Полуприцеп тракторный универсальный | **2 320,29** | **116,01** | 116,01 |
| лот №13 | МТЗ-952 OA 4417 | 09002021 | 2000 | Трактор | **1 697,63** | **84,88** | 84,88 |
| лот №14 | Беларус-1221 B OA-5 9436 | 12019586 | 2007 | Трактор (фронтальный погрузчик) | **4 760,72** | **238,03** | 238,03 |
| лот №15 | МТЗ-82.1 OA 2459 | 457409 | 1998 | Трактор | **1 385,18** | **69,25** | 69,25 |

**ОБОРУДОВАНИЕ**

| | Наименование | Характеристики | Стоимость, с НДС в руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона (5%), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| лот №16 | Павильон торговый | 2 * 4 | 852 | 42,6 | 42,6 |
| лот №17 | Павильон торговый | 3,5 * 3,5 | 488,4 | 24,42 | 24,42 |

**Условия оплаты:**

Оплата за транспортные средства и оборудование (лоты №№ 2,3,4,5,6,7,8, 9,10,11,12,13,14,15,16,17) производится в течение 10 банковских дней с момента подписания договора.

Аукцион состоится **11.09.2017 г. в 13.00** по адресу: Минская область, Молодечненский район, а/г Олехновичи, ОАО «Агрокомбинат «Олехновичи», ул. Радошковичская, 43, актовый зал.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **08.09.2017 г. до 16.00** по адресу: Минская область, Молодечненский район, а/г Олехновичи, ул. Радошковичская, 43, ОАО «Агрокомбинат «Олехновичи», приемная.

Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление на участие в торгах с приложением следующих документов:

